штотыднёвая грамадска-асветніцкая газета

КУЛЬТУРА

1 кастрычніка 2022 г.
№40 (1583)

ГОД ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ
Як Якуб Колас дэпутатам быў. Невядомыя старонкі жыцця паэта
стар. 14–15

ІНІЦЫЯТЫВА "К"
Маляўнічы флігель у палоне хмызняку. Незайздросны лёс гістарычнай перліны
стар. 6

СУСТРЭЧЫ Ў РЭДАКЦЫІ
Суполка няўрымслівых творцаў, або Як патрапіць у запыты аўдыторыі
стар. 5

МАКСІМА МАЛАДЫХ
З маленькай вёскі – на вялікую сцэну. Сакрэты поспеху і вакальныя фішкі
стар. 7



"К. Міцкевіч з кнігай". Святаслаў Федарэнка. Палатно, алей. 1982. Фота з фондаў музея

Педагогі Беларусі заўтра адзначаць прафесійнае свята. У гэты дзень варта ўспомніць і выдатных настаўнікаў-папярэднікаў, сярод якіх быў Якуб Колас. Будучы народны паэт атрымаў грунтоўную падрыхтоўку ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі, дзе вывучаў тэалогію, асновы педагогікі, мовы, арыфметыку, гісторыю і мноства іншых дысцыплін. У гэтай установе адбылася і важная сустрэча ў літаратурным лёсе Якуба Коласа: выкладчык славеснасці Фядот Кудрынскі ацаніў работы маладога творцы і параіў пісаць менавіта на роднай мове.

Педагагічная біяграфія Канстанціна Міцкевіча была сапраўды пакручастай. Пасля атрымання звання настаўніка пачатковага вучылішча выпускнік паехаў у палескую глуш, у Люсінскае народнае вучылішча на тэрыторыі цяперашняга Ганцавіцкага раёна. Пазней выкладаў у Пінкавічах – гэты этап добра адлюстраваны ў трылогіі "На ростанях". Затым настаўніка пераводзіць на новае месца ў Ігуменскі павет.

9 ліпеня 1906 года – важная дата не толькі ў біяграфіі класіка, але ў гісторыі нашай краіны. Удзельнікі настаўніцкага з'езду ў Мікалаеўшчыне, выказалі вернасць высокай мэце – служэнню народнай асвеце. І нягледзячы на перашкоды Колас працягвае задуманае – арганізуе "дамашнюю школу" і працуе над "Другім чытаннем для дзяцей беларусаў". Ужо ў савецкія гады ён далучаецца да падрыхтоўкі маладых калег. Творца чытаў лекцыі па методыцы і граматыцы беларускай мовы на курсах, а роўна сто гадоў таму – у 1922-м – правёў першыя свае заняткі ў Беларускім педагагічным тэхнікуме.

"Ён быў па сутнасці галоўнай або адной з галоўных фігур у працэсе стварэння беларускай школы, пачынальнікам і бацькам метадычнай навукі ў галіне моўнага і літаратурнага навучання ў Беларусі. Такім чынам, да канца сваіх дзён народны паэт БССР заставаўся і народным настаўнікам", – адзначае праўнучка класіка, галоўны захавальнік фондаў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Васіліна Міцкевіч.

Больш фактаў пра настаўніцкі шлях класіка чытайце на сайце Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа

НА ЛЮДНЫМ МЕСЦЫ
Дасціпныя жарты, трапныя афарызмы і глінтвейн на беларускі лад. Восеньскія святы і фестывалі
стар. 10

СОЦЫУМ
Млыны, авеяныя легендамі. Сапраўдныя разынкі турыстычных маршрутаў
стар. 4

9 771994 478007 22040

“Славянскі базар”, тэатр эстрады, “Беларусьфільм”...

Візіт у Маладзёжны тэатр эстрады

...І гэта далёка не ўвесь спектр пытанняў, разгледжаных на гэтым насычаным падзеямі тыдні, у якіх прыняў удзел Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Анатолій Маркевіч.

Так, 27 верасня адбылося паседжанне рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта пад кіраўніцтвам Намесніка Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь Ігара Петрышэнкі, дзе былі абмеркаваны вынікі правядзення XXXI Міжнароднага фестывалю мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску” і падыходы да яго правядзення ў 2023 годзе.

Міністр культуры Анатолій Маркевіч адзначыў паспяховую рэалізацыю праграмы мерапрыемстваў фестывалю, запатрабаванасць фестывальных праектаў у гледачоў. “Славянскі базар” паранейшаму з’яўляецца візітнай карткай Беларусі ў свеце мастацтва.

Але было адзначана, што ёсць куды развівацца далей. Пастаўлены задачы па абнаўленні праграмы і фармату правядзення асноўных мерапрыемстваў, насычэнні фестывальнай палітры новымі праектамі, у тым ліку для моладзевай аўдыторыі, з асваеннем новых пляцовак для іх правядзення. Будзе наладжана больш шчыльнае супрацоўніцтва з расійскім бокам па рэалізацыі праектаў Саюзнай дзяржавы.

Так што чарговы музычны форум мастацтваў у Віцебску ў 2023 годзе абяцае зазіхаць новымі фарбамі з прыемнымі сюрпрызамі.

28 верасня Ігар Петрышэнка і Анатолій Маркевіч разам наведалі Маладзёжны тэатр эстрады.

Развіццё тэатра эстрады, папулярызацыі яго дзейнасці — вось асноўныя тэмы дыялогу з кіраўніцтвам тэатральна-відовішчнай установы. Былі закрануты пытанні ўдасканалення і ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы, арганізацыі выступленняў артыстаў на тэрыторыі краіны і за яе межамі.

Таксама 28 верасня Міністр культуры пабываў на Нацыянальнай кінастудыі “Беларусьфільм”, дзе разам з Генпракурорам Беларусі **Андрэем Шведам** і гендырэктарам кінастудыі **Уладзімірам Карачэўскім** абмеркаваў вытворчасць кінафільмаў. У тым ліку размова ішла аб рабоце над нацыянальным праектам пад рабочай назвай “Мы адзіныя”. Анатолій Мечыславіч і Андрэй Іванавіч азнаёміліся з работай цэхаў кінастудыі.

У сумесных планах Генпракуратуры і кінастудыі — супрацоўніцтва ў галіне асвятлення тэм генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і жыцця суайчыннікаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі пасля заключэння Рыжскага мірнага дагавора.

Была падкрэслена значнасць захавання гістарычнай памяці і недапушчэнне скажэння гісторыі.

29 верасня Анатолій Маркевіч прыняў удзел у анлайн-сустрэчы, арганізаванай пасольствам КНР у Рэспубліцы Беларусь з нагоды 73-годдзя Кітайскай Народнай Рэспублікі.

— Апошнія гады развіццё беларуска-кітайскіх адносін актывізавалася ва ўсіх сферах. Нягледзячы на геаграфічную адлегласць, дзяржавы пастаянна знаходзяць новыя магчымасці ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, — адзначыў Анатолій Мечыслававіч.

Сярод напрамкаў дзейнасці ў галіне гуманітарнага супрацоўніцтва трэба адзначыць работу камісіі па культурным супрацоўніцтве беларуска-кітайскага міжурадавага камітэта, абменныя Дні культуры паміж Рэспублікай Беларусь і Кітайскай Народнай Рэспублікай, якія праходзяць з 2011 года.

— Усё гэта з’яўляецца ўкладам у пашырэнне і ўмацаванне дружбы паміж нашымі народамі, — рэзюмаваў міністр. — Толькі сумеснымі намаганнямі мы зможам практычна рэалізаваць ідэі збліжэння народаў і ўмацавання супрацоўніцтва!

Пасяджэнне рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта

З увагай да мінулага і будучыні

Чарговая апаратная нарада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатолія Маркевіча з начальнікамі ўпраўленняў і аддзелаў міністэрства адбылася 27 верасня. Дзякуючы сродкам відэасувязі ўдзел у нарадзе прынялі таксама начальнікі ўпраўленняў культуры абласных выканаўчых камітэтаў.

Былі прааналізаваны вынікі правядзення фестываляў і конкурсаў, якія ладзяцца на рэгулярнай аснове ў рэгіёнах краіны. Міністр падкрэсліў патрэбу збору інфармацыі аб таленавітай моладзі, што дапаможа рэжысёрам культурна-відовішчных мерапрыемстваў пры падборы новых артыстаў для выступаў.

Анатолій Маркевіч таксама звярнуў увагу на неабходнасць актывізацыі работы па выкананні Пастановы Савета Міністраў № 401 ад 22 чэрвеня 2022 года “Аб рэестры арганізатараў культурна-відовішчных мерапрыемстваў”, падкрэсліваючы патрэбу супрацьдзеяння незаконнай дзейнасці ў гэтай галіне, паўнамоцтвы па якім ускладзеныя на мясцовыя органы ўлады.

Разглядаліся пытанні стварэння музейнай экспазіцыі ў мемарыяльным комплексе “Хатынь”. Вядзецца работа над мастацкай канцэпцыяй экспазіцыі, у адпаведнасці з якой музейная прастора будзе налічваць шэсць залаў, па якіх будзе арганізаваны кругавы рух. Мяркуецца, што храналагічна экспазіцыя ахопіць падзеі ад X да XX стагоддзя, уключна з усімі войнамі, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі, а асаблівая ўвага будзе нададзеная гісторыі Хатыні і іншых спаленых беларускіх вёсак.

На патрэбы стварэння музея на 2022 год выдзелена 10,6 мільёнаў рублёў, кошт экспазіцыі складае каля трох мільёнаў. Мяркуецца, што агульная плошча музея будзе налічваць тысячу квадратных метраў.

Чарговы раз уздымалася пытанне заканчэння работ па добраўпарадкаванні тэрыторый і пабудоў у філіялах Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа ў Стаўбцоўскім раёне, а таксама выпуску сувенірнай прадукцыі, прысвечанай святкаванню 140-годдзя народнага паэта Беларусі, якое прыпадае на 3 лістапада.

У лістападзе запланаваны ўвод у эксплуатацыю першага пускавога комплексу палацава-паркавага ансамбля Валоўчай другой паловы XVIII стагоддзя ў Свяцку Гродзенскага раёна, у які ўваходзяць бакавыя галерэі, бар і гасцявы дом. Таксама мусяць быць завершаныя добраўпарадкаванне і пракладка інжынерных сетак.

Дагрукацца да кожнага

29 верасня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылося пасяджэнне калегіі Міністэрства культуры, на якім абмяркоўваліся стан і перспектывы развіцця культурна-асветных устаноў рэспублікі — музеяў, бібліятэк і арганізацый клубнага тыпу.

Сярод разгледжаных пытанняў — аналіз развіцця сеткі ўстаноў культуры, кадры, матэрыяльна-тэхнічная база ўстаноў, культурнае абслугоўванне насельніцтва, у тым ліку ў сельскіх населеных пунктах.

З дакладам на пасяджэнні калегіі выступіла начальнік упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Ірына Карповіч, чыё выступленне выклікала дыскусію, у рамках якой прадстаўнікі рэгіёнаў і кіраўнікі арганізацый абмяняліся думкамі па абмеркаваній тэматыцы. Аб праведзенай рабоце па выкананні нарматываў забяспечанасці аграгарадкоў Мінскай вобласці арганізацыямі культуры і мерах, якія прымаюцца па замацаванні маладых спецыялістаў на месцах, даклажыла начальнік галоўнага ўпраўлення культуры Мінскага аблвыканкама Ала Шахоцька. Акрамя таго, аб арганізацыі кантролю за работай устаноў культуры Гомельскай вобласці, у тым ліку па выкананні заканадаўства аб арганізацыі дасугавай дзейнасці непаўналетніх, расказаў начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама Дзяніс Язерскі. Таксама разглядалася пытанне аб метадычным суправаджэнні дзейнасці культурна-асветных устаноў.

Вобраз Сінявокай у кітайскім жывапісе

Выстава “Выява Беларусі ў традыцыйным кітайскім жывапісе” адкрылася 28 верасня ў выставачнай зале “Акадэмія” Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.

Экспазіцыя — персанальная выстава Лю Хэйцзюня, саіскальніка БДАМ, выкладчыка Ханьшаньскага педагагічнага ўніверсітэта (правінцыя Гуандун, Кітай). Большасць твораў, прадстаўленых у экспазіцыі, выкананы кітайскай тушшу і акварэллю на рысавай паперы.

Работа экспазіцыі прадоўжыцца па 18 кастрычніка. Праект арганізаваны БДАМ у супрацоўніцтве з Ханьшаньскім педагагічным універсітэтам.

Падчас сустрэчы

Дзякуй за працу!

Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Анатолій Маркевіч на святочнай сустрэчы, прысвечанай Дню пажылых людзей, выказаў словы падзякі ветэранам у сферы культуры, якія ў розныя часы працавалі ў міністэрстве, а цяпер знаходзяцца на заслужаным адпачынку.

Гэта шчырая даніна павагі працы і вопыту, удзячнасць за вялікі ўклад у развіццё нацыянальнай культуры і роднай Беларусі.

Пасол Рэспублікі Беларусь у Ісламскай Рэспубліцы Іран Дзмітрый Кальцоў і міністр культуры і ісламскай арыентацыі Ірана Махамадам Мехдзі Эсмаілі

“Лістапад” — кінематаграфісты розных краін, рыхтуйцеся!

Сёння, 1 кастрычніка, апошні дзень прыёму заявак на ўдзел у конкурсных праграмах XXVIII Мінскага міжнароднага кінафестывалю "Лістапад", які пройдзе ў сталіцы Беларусі з 4 па 11 лістапада.

Кінафорум абяцае быць не толькі цікавым і насычаным, але ў нейкай ступені і рэкордным. Размова ідзе аб колькасці заявак для ўдзелу ў фестывалі. Толькі на апошні тыдзень верасня жадаючых з’явіцца перад беларускай публікай ужо больш за тысячу. І гэта не мяжа!

За некалькі дзесяцігоддзяў “Лістапад” памужнеў, падрос і стаў падзеяй для кінагурманаў з усяго свету. Мяркуйце самі.

Па словах генеральнага дырэктара кінастудыі “Беларусьфільм” Уладзіміра Карачэўскага, на “Лістапад-2022” з’едуцца прадстаўнікі з Паўночнай і Лацінскай Амерыкі, Еўрапейскага кантынента, Азіі. Будзе прадстаўлена больш за 80 краін! Фестываль становіцца тэмай абмеркавання на міжнародных сустрэчах. Напрыклад, вынікам сустрэчы Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Ісламскай Рэспубліцы Іран Дзмітрыя Кальцова і міністра культуры і ісламскай арыентацыі Ірана Махамада Мехдзі Эсмаілі стала тое, што неўзабаве беларускія гледачы ўбачаць пастаноўку іранскіх кінематаграфістаў.

Дырэкцыя кінафестывалю — Нацыянальная кінастудыя “Беларусьфільм” — праводзіць вялікую працу па адборы найлепшых заявак, а пасля экспертам са складу журы трэба будзе кратпліва працаваць, каб вызначыць лепшых у чатырох конкурсных праграмах: ігравое кіно, неігравое (дакументальнае) кіно, анімацыйныя фільмы, фільмы для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі “Лістападзік”.

У рамках фестывалю адбудзецца мноства творчых сустрэч, майстар-класаў.

Скразной ніткай праз міжнародны кінафорум пройдзе тэма "Год гістарычнай памяці".

Можна не сумнявацца, што “Лістапад” у чарговы раз сагрэе сэрцы прыхільнікаў кіно душэўнымі фільмамі, пацвердзіўшы свой цяперашні слоган: “Сапраўдныя каштоўнасці”.

Неверагодны “Уік-энд”

Пачатак юбілейнага, 90-га сезона нашага Вялікага тэатра адзначаны шэрагам нешараговых падзей. 28 верасня тут адбылася прэм’ера балета “Жызэль” сёння, у Міжнародны дзень музыкі — прэм’ера оперы "Моцарт і Сальеры" ў Камерный зале. А напярэдадні, у мінулыя суботу і нядзелю, прайшла акцыя “Уік-энд у Вялікім”.

Квіток на “Уік-энд” каштаваў усяго 1 рубель. За гэты сімвалічны кошт можна было бавіць час у тэатры з 12 да 17 гадзін. Да не проста бадзяцца па фае розных паверхаў, а наведаць безліч падрыхтаваных калектывам цікавостак. Тут было ўсё: некалькі камерных канцэртаў, на адным з якіх была выканана музычная казка С.Пракоф’ева “Пеця і Воўк”, невялічкія экскурсіі, майстар-класы па ігры на ўдарных інструментах і азах балетнага мастацтва, адкрытыя рэпетыцыі (у тым ліку балета “Жызэль”), шматлікія фоназоны, дзве выставы з незвычайнымі экскурсаводамі. Экспазіцыю, прысвечаную памяці народнай артысткі СССР Святланы Данілюк, каментаваў сын легендарнай опернай дзівы — рэжысёр Максім Федасееў. А па выставе мастачкі Кацярыны Булгакавай, дзе былі не толькі прыдуманыя ёй сцэнічныя строі, але і ўласна жывапісныя работы, вадзіла яна сама.

Увогуле творчых сустрэч з дзеячамі тэатра было шмат, зоркі шчодра раздавалі аўтографы шматлікім прыхільнікам. Да таго ж можна было пакінуць словы ўдзячнасці ў пісьмовым выглядзе: для такіх пасланняў быў усталяваны спецыяльны “чароўны куфэрак”, які, дарэчы, будзе збіраць віншаванні тэатра з юбілеем ажно да мая. Усяго за два дні тэатр наведала больш як 4200 чалавек — неверагодна! Але факт.

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Прынцыповая думка

Хоць трэсніце!

Забаронамі на ўсё зямля поўніцца. Прычым калі раней у розных забаронах абвінавачвалі ў тым ліку і нашу Беларусь, якая за выбраны ўласны шлях развіцця падвяргаецца санкцыйнай агрэсіі ўжо не адно дзесяцігоддзе, то масавыя абсурдныя забароны, якія прымяняюцца калектыўным Захадам, успрымаюцца лёгка і проста: трэба — значыць, трэба.

Трэба парушыць асноўны пастулат дэмакратычнага свету, што свабода слова недатыкальная? Калі ласка! Парламент Літвы прымае папраўкі ў закон аб забароне трансляцыі беларускіх і расійскіх тэле- і радыёпраграм у краіне да кастрычніка 2024 года. Ім, ці бачыце, спатрэбілася абараніць свой народ ад прапаганды тэлеканала "Беларусь 1". Засцерагчы яго ад навін з беларускіх палёў і заводаў. Зняць раздражненне пасля рэпартажаў з фестывалю працаўнікоў сяла ў Стоўбцах. Не дазволіць пачуць аб развіцці культурных міждзяржаўных сувязей. Заглушыць голас розуму, які заклікае да захавання добрасуседскіх адносін. А можа драўляная калода, якую раскалоў Аляксандр Лукашэнка для палякаў, так зачапіла тых, хто мае ўладу ў Літве? І пакрыўдзіўшыся, што дровы беларусы пачалі масава нарыхтоўваць не для іх, яны вырашылі напярэдадні сезона халадоў не глядзець на нашыя дравяныя запасы? Пытанні застаюцца. Толькі вось бліжэйшыя суседзі — Польшча, Літва, Латвія — з нейкай незразумелай істэрыяй патрабуюць ад Еўрасаюза ўвядзення супраць нашай краіны такіх жа санкцый, як і супраць Расіі. Хаця ўжо даўно сам ЕС прызнаў, што Беларусь не з'яўляецца бокам канфлікту ва Украіне.

Чаму ж ім так карціць насаліць нам? Мусіць, мяркуюць: напярэдзе складаныя часы, і каб ім, агрэсіўным "суседкам", жылося добра і спакойна, камусьці, а ў дадзеным выпадку нам, трэба жыць дрэнна, а яшчэ лепш, калі мы будзем забіваць адзін аднаго: беларусы, украінцы, рускія... Да гэтага і вядуць, распальваючы і падтрымліваючы агонь нянавісці паміж народамі, называючы гэта "нулявой талерантнасцю". А потым заходні свет будзе апраўдваць гэтай нянавісцю свае злачынствы.

Услед за няўдалай спробай адмяніць рускую культуру некаторыя краіны вырашылі пайсці даўжэйшым шляхам — забараніць рускіх людзей на Захадзе. Расіян перасталі пускаць на тэрыторыю шэрагу дзяржаў Еўрасаюза, нават калі ў іх ёсць дзейная шэнгенская віза. Вось вам і свабода перамяшчэння. Нявартыя расейцы, маўляў, не маюць права таптаць землі, прасякнутыя духам свабоды, яны людзі іншага, адрознага ад “іх вялікасці еўрапейцаў”, плана. А можа ўжо і людзі іншага гатунку... Хутка "асененыя мілатой дэмакратыі" запатрабуюць падобнай забароны і для беларусаў. Адной з прычын такога развіцця сітуацыі становіцца і дзейнасць змагароў, якія размясціліся ў Варшаве і Вільні. Яны ад патрабаванняў санкцый палітычных і эканамічных перайшлі да новага пераканання, што без "сілавога кампанента", так яны завуялявана называюць вайну супраць Беларусі, іх "перамога" не больш чым мара. Таму і выступаюць за забароны і абмежаванні для беларусаў, спрабуюць расхістаць сітуацыю ў нашай краіне, каб заявіць, што ва ўсім вінаваты "рэжым".

Забарона на заняцце пасад, забарона на ўдзел у працы ААН, забарона гандляваць, забарона купляць, забарона лётаць самалётам, забарона размаўляць, забарона казаць... Хутка хтосьці прапануе ўвесці забарону думаць. У тым ліку і думаць ад тым, што мы, беларусы, зрабілі свой выбар: асэнсаваны, складаны, некаторым незразумелы, але свой. Жывем у сваёй краіне, дзе шануюць традыцыі, памятаюць урокі гісторыі, захоўваюць памяць...

Памяць аб спаленай Хатыні. Памяць аб канцлагеры для дзяцей у Скобраўцы. Памяць аб расстраляных ва ўрочышчы Бронная Гара. Памяць аб салдатах Чырвонай арміі і партызанах. І ніякімі надуманымі абмежаваннямі гэтую памяць у нас не адабраць. Яна аснова нашага светапогляду, які сфармаваўся пад ударамі і выпрабаваннямі лёсу ад паходаў крыжакоў да спроб "каляровых рэвалюцый".

Вытрымліваючы гэты перыяд забарон, мы паказваем гістарычную праўду, якую наш народ захаваў, а забараніць Памяць, як ні намагайцеся, у вас, "дэмакраты", ніколі не атрымаецца! Хоць трэсніце!

Аляксандр КРАГЕЛЬ

КУЛЬТУРА / KULTURA-INFO.BY
№ 40 / 1 КАСТРЫЧНІКА 2022 г.





Новае жыццё старых заводаў

Якія перспектывы паўстаюць перад помнікамі прамысловай архітэктуры ў Беларусі?

Індустрыяльныя пабудовы мінулых стагоддзяў усё часцей пачынаюць успрымацца як частка гісторыка-культурнай спадчыны.
Старыя будынкі заводаў, фабрык, электрастанцый з адметным архітэктурным абліччам робяцца турыстычнымі абектамі, прыстасоўваюцца для патрэб грамадства, ператвараюцца ў прасторы для адпачынку або музейныя залы. Гэтая тэндэнцыя актуальная і для нашай краіны.

На жаль, вядома, не ўсе прамысловыя аб'екты маюць шанец упісацца ў намеры сучасных горадабудаўнікоў. Зусім нядаўна, у сярэдзіне верасня, быў зруйнаваны корпус хлебазавода № 1 на Віцебскай вуліцы, 17а, у Мінску. Узведзены яшчэ ў 1920-я гады, гэты трохпавярховы будынак з чырвонай цэглы меў выразныя рысы архітэктуры канструктывізму — стылю, які ў згаданы час быў распаўсюджаны і ў адміністратыўным, грамадскім ды жылым будаўніцтве. Адметна прытым, што да нядаўняга часу ў адным з пад'ездаў будынка знаходзіліся жылыя памяшканні. Шкада, гэтаму міжваеннаму гмаху, які не меў статусу помніка, не знайшлося месца ў праекце рэгенерацыі тэрыторыі Ракаўскага прадмесця. Але затое больш пашанцавала пасляваенным будынкам хлебазавода, размешчаным па суседстве, — яны рэканструяваныя і ўключаныя ў сквер новага квартала, які мяркуецца зрабіць пешаходнай зонай.

Прыстасаванне прамысловых аб'ектаў, размешчаных у гістарычных цэнтрах гарадоў, — праблема адносна новая. Няма нічога дзіўнага ў тым, што прадпрыемствы, якія некалі ўзнікалі на ўскраінах і ў прадмесцях, з часам, у працэсе росту гарадоў, апыналіся амаль у самым іх сэрцы. З найбольш яскравых прыкладаў можна прыгадаць будынкі піўзавода на ўзбярэжжы Нёмана ў Гродне альбо коління абутковую і шпалерную фабрыкі ў сталіцы, комплексы якіх размешчаны па суседстве з ужо згаданым хлебазаводам. Многія мінчукі яшчэ памятаюць гмахі колішняй бісквітнай фабрыкі, якія ўзвышаліся на левым беразе Свіслачы ў раёне Старажоўскай вуліцы да сярэдзіны 1990-х. Тады існаваў нават праект іх рэгенерацыі, выкананы архітэктарам Леанідам Левіным, — але ён, на жаль, не быў рэалізаваны. Як бачым, з часам у Беларусі пачалі больш абачліва ставіцца да магчымасці прыстасавання прамысловых збудаванняў для карысці грамадства — але ўдалечыні ад буйных гарадоў праблема захавання такіх будынкаў і іх запатрабаванасці ўсё яшчэ застаецца вострай.

СВЕДКІ ЗАРАДЖЭННЯ ІНДУСТРЫІ

Так, на жаль, не атрымаў ахоўнага статусу і знаходзіцца пад пагрозай канчатковага разбурэння велізарны комплекс будынкаў цэментнага завода "Перамога" ў гарадскім пасёлку Краснасельскі, што ў Ваўкавыскім раёне. Узведзены яшчэ перад Першай сусветнай вайной, гэты завод адметны тым, што яго прадукцыя выкарыстоўвалася ў тым ліку для будаўніцтва ўмацаванняў Гродзенскай крэпасці — комплекса фартоў, які быў створаны для абароны Гродна. Прытым існавалі і планы прыстасавання будынкаў завода для турыстычных мэтаў — але пакуль яны засталіся нерэалізаванымі.

Ёсць і прыкрыя выпадкі, калі прамысловыя аб'екты ў нашыя дні знішчаюцца ў выніку безгаспадарнага стаўлення і давядзення іх да занядбанага стану. Так, у Бабруйску ў жніўні распачалося руйнаванне больш чым стогадовага будынка колішняга вінакурнага завода, які быў добра заўважны з мясцовай чыгуначнай станцыі і фактычна з'яўляўся адной з візітных картак горада. Будынак быў выдатным узорам дарэвалюцыйнай прамысловай архітэктуры і меў на галоўным фасадзе лацінскі надпіс "Vinitus unitis" (Саюз вінаробаў"). А ў Магілёве сёлета ў красавіку пацярпеў ад пажару колішні будынак першай гарадской электрастанцыі на Крутым завулку, 3, які быў зведзены ў 1910 годзе і перабудаваны ў міжваенныя гады пад жылы дом, які з часам прыйшоў у занядбанне. Мясцовым уладам варта было б больш пільна ставіцца да падтрымання такіх будынкаў у прымальным стане і пошуку інвестараў, якія маглі б надаць гэтым аб'ектам новае жыццё.

На фота:
1, 4 — Будынкі колішняга хлебазавода на Ракаўскай вуліцы ў Мінску
2 — Воданапорная вежа на сталічным праспекце Жукава
3 — Вадзяны млын у Іўі

МУЗЕЙ У МЛЫНЕ

Але ёсць і пазітыўныя прыклады прыстасавання ўзораў прамысловай архітэктуры. Напрыклад, у некалі занядбаным будынку былой суконнай фабрыкі "Дняпроўская мануфактура", збудаванай у пачатку мінулага стагоддзя ў Дуброўне Віцебскай вобласці, у выніку рэканструкцыі 2018 года размешчаная зала грамадскіх абрадаў і музейны пакой, прысвечаны гісторыі прадпрыемства. У справе прыстасавання прамысловых аб'ектаў пад свае патрэбы часта ўдзельнічаюць і вернікі хрысціянскіх канфесій: так, у Солах Смаргонскага раёна і Мар'інай горцы на Міншчыне былі пераабсталяваныя пад царкву і касцёл адпаведна будынкі гаспадарчай пабудовы і электрастанцыі, узведзеныя ў пачатку мінулага стагоддзя.

Яшчэ адна цікавая група прамысловых аб'ектаў, якія заслугоўваюць больш пільнага стаўлення і маюць вялікі турыстычны патэнцыял, — млыны ўсіх відаў. Ветракі, якія захаваліся ў Беларусі, можна пералічыць на пальцах рук, і яны, на жаль, мала прыдатныя для якога-кольвек пераабсталявання, што і прыводзіць часта да разбурэння гэтых драўляных канструкцый. Неабароненыя ні ад людской безгаспадарнасці, ні ад уздзеяння ўмоў навакольнага асяроддзя, толькі за апошнія дваццаць гадоў такім чынам былі страчаныя пяць млыноў у розных кутках краіны.

А вось лік будынкаў колішніх вадзяных і паравых млыноў ідзе на дзясяткі. Размешчаныя ў малаўнічых мясцінах, авеяныя легендамі і паданнямі, яны могуць зрабіцца сапраўднымі перлінамі турыстычных маршрутаў у самых розных кутках краіны. Многія будынкі млыноў захаваліся ў добрым стане і знаходзяцца ў населеных мясцовасцях, таму пры належным падыходзе іх можна было б выкарыстоўваць для самых розных грамадскіх патрэб. Тое ж тычыцца, зрэшты, і шматлікіх будынкаў броварэў ды вінакурняў, якія захаваліся ў складзе многіх палацава-паркавых комплексаў — лік такіх будынкаў па ўсёй краіне дасягае палутара соцень.

ДАМІНАНТЫ ГАРАДСКОГА КРАЯВІДУ

Выдатнымі аб'ектамі ў гарадскім асяроддзі, што могуць быць прыстасаваныя пад грамадскія патрэбы, з'яўляюцца і воданапорныя вежы. На жаль, за апошнія два дзесяцігоддзі былі знішчаныя воданапорныя вежы канца XIX — пачатку XX стагоддзяў у Ашмянах, Друці, Міханавічах, Урэччы, а таксама ў Бабруйскай крэпасці. У Мар'інай Горцы была зруйнаваная і адна з трох беларускіх гіперболоідных вежаў, збудаваных у 1920-я па праекце вядомага савецкага архітэктара Уладзіміра Шухава, — яе "сёстры" захаваліся ў Звянячах Талачынскага раёна і Барысаве.

Затое сярод удалых прыкладаў прыстасавання воданапорных вежаў у межах гарадоў можна назваць выпадкі ў Бабруйску, дзе ў вежы размешчаны рэстаран і аглядная пляцоўка, або ў Гродне, дзе дзве размешчаныя побач вежы, вядомыя сярод гараджан як "Кася і Бася", зрабіліся прытулкам для мастацкіх майстэрань. А вось лёс адзінай воданапорнай вежы пачатку XX стагоддзя, якая дайшла да нашых дзён у Мінску і размяшчаецца на праспекце Жукава, дагэтуль застаецца нявызначаным — пасля пэўных спробаў рэстаўрацыі яна зноў выстаўленая на продаж. Застаецца спадзявацца, што аб'екты такога кшталту змогуць зацікавіць патэнцыйных уласнікаў і яшчэ паслужаць на карысць як нашаму грамадству, так і аматарам індустрыяльнага турызму з ліку замежных гасцей.

Антон РУДАК

КУЛЬТУРА / KULTURA-INFO.BY
№ 40 / 1 КАСТРЫЧНІКА 2022 г.

Тут ёсць зварот да чалавека

Калектыў Цэнтра культуры "Віцебск" — суполка няўрымслівых творцаў, якія ледзь не кожны дзень робяць святочным. Акрамя "Славянскага базару", які немагчыма ўявіць без гэтых людзей, іх энергіі і крэатыву хапае на мноства іншых фестываляў і працу з самадзейнымі артыстамі. Зараз каманда пачынае новы, 67-ы сезон. З гэтай нагоды ў нашай рэдакцыі адбылася сустрэча з генеральным дырэктарам ўстановы Глебам Лапіцкім.

Наш госць — Глеб Лапіцкі

— Глеб Аляксандравіч, прапаную перад гутаркай аб новым сезоне падвесці творчыя вынікі лета. Пра "Славянскі базар" ведае ўся краіна, але гэта дакладна не адзінае, чым вы можаце пахваліцца...

— Лета лічыцца часам адпачынку, а ў нас гэта вельмі бурлівы творчы перыяд. "Славянскі базар" завяршаецца — і мы пачынаем рыхтаваўца да наступнага цікавага праекту пад назвай "Арт-змена". Сёлета ладзілі яго трэці раз, і штогод далучаецца ўсё больш і больш дзяцей. Удзельнікі нашых калектываў на два тыдні паглыбляюцца ў рэпетыцыйны працэс, пры гэтым займаюцца з кіраўнікамі не толькі сваіх аб'яднанняў, але і іншых. Напрыклад, выхаванцы ансамбля "Зорка", які робіць акцэнт на народную харэаграфію, засвойваюць падчас праекту і бальныя, і сучасныя танцы. Да таго ж "Арт-змена" ўключае вялікую асветніцкую праграму: дзеці наведваюць музеі, ладзяць бардаўскія вечарыны. За два тыдні дапамагаем зразумець удзельнікам, у якім горадзе яны жывуць і колькі цікавага навокал. Удзел платны, што дазваляе пакрыць кошт уваходных квіткоў. Такім чынам мы не толькі ладзім карысны адпачынак для дзяцей, але дапамагаем калегам з філіялаў і іншых устаноў пашырыць аўдыторыю, знайсці новага гледача. Таму гэта добры карпаратыўны праект.

Далей адбыліся імпрэзы да Дня ведаў. У нас ёсць ужо класічны праект — вялікія канцэрты ў летнім амфітэатры для навучэнцаў пачатковай і сярэдняй школы. Сёлета правялі яшчэ вечарыну для старшакласнікаў і студэнтаў. Асабліва важна гэта для першакурснікаў, якія толькі прыехалі ў Віцебск. Трэба, каб яны пазнаёміліся з горадам, пасябравалі са студэнтамі іншых вну. І ў гэтым рашэнне многіх стратэгічных задач, напрыклад, замацаванне маладых людзей у гэтым месцы. Імпрэза добра сябе зарэкамендавала: прыйшло каля трох тысяч наведвальнікаў. Для іх выступалі нашы самадзейныя калектывы, а таксама запрошаныя хэдлайнеры — лаўрэат "Славянскага базару" Ваня Зданюк і SLAME, артыст лэйбла Black Star.

Мы ладзім падобныя імпрэзы, не чакаючы нейкіх даручэнняў. Можна было б радавацца, што ў нас ёсць "Славянскі базар", і больш нічога не рабіць. Але мы не любім сядзець на месцы, хочам, каб кожны знаходзіў прастору для самарэалізацыі. І нам вельмі важна пазіцыяніраваць Віцебск у тым ліку як маладзёжны горад. Таму акрамя правядзення спецыяльных дзяржаўных мерапрыемстваў абласнога ўзроўню і працы з самадзейнымі калектывамі, актыўна развіваем праектную дзейнасць.

— Мяркуючы па фотаздымках, на вашых імпрэзах заўсёды людна. Якім чынам удаецца заўсёды збіраць поўныя пляцоўкі і трапляць у запыты аўдыторыі?

— Нехта будзе расказваць пра планаванне і прагназаванне, але насамрэч у нашай сферы ўсё на грані інтуіцыі і ўдачы. У наш час здараецца шмат форс-мажораў, якія за гадзіну ці за дзесяць хвілін да пачатку могуць змяніць імпрэзу. Праз тыя ж ковідныя абмежаванні. Калі казаць пра наведвальнасць, тут сакрэт у сваёй сетцы інфармавання. Напрыклад, у мяне не знойдзецца тысяча долараў на таргетаваную рэкламу, але можна данесці да моладзі нешта праз дырэктараў устаноў адукацыі. Я не кажу пра выкарыстанне адміністратыўнага рэсурсу для навязвання і нейкага прымусу. Дастаткова, каб на зборы першакурснікаў кіраўнік перадаў абвестку, і ахвотныя завітаюць на імпрэзу. І самае галоўная — палітыка коштаў. На дзіцячыя мерапрыемствы ў нас квіткі ад пяці да дванаццаці рублёў.

— Ці ўдалося вам выпрацаваць нейкі рэцэпт, як сумясціць забаўляльныя праекты для моладзі з выхаваннем?

— Варта разумець, што сучаснымі метадамі можна данесці аўдыторыі важную інфармацыю. Мы ставім задачу арганізаваць вольны час так, каб маладыя людзі зразумелі: у нашым горадзе будзе цікава. Тая ж гарадская вечарына да Дня ведаў. Мы не прапанавалі наведвальнікам урок на 45 хвілін, а расказалі ў іншым фармаце, чым славіцца Віцебск.

> Мы заўсёды заклікаем бацькоў рабіць інвестыцыі ў сваіх дзяцей. Кошт заняткаў у творчым калектыве — гэта не тая сума, якую можна пакласці ў банк пад працэнты, а вось для будучыні дзяцей гэта важны ўнёсак. Неабходна, каб яны выхоўваліся ў творчым асяроддзі з маленства.

Падрабязней пра творчыя калектывы — на сайце Цэнтра культуры "Віцебск"

Трэба рабіць акцэнт на нечым пачуццёвым, інтуітыўным. Вось на патрыятычным форуме 17 верасня ў "Мінск-Арэне" гучала песня "Беларусь Незалежная". І гэта сапраўдная патрыётыка. Там ёсць зварот да чалавека — "Мы — гэта краіны багацце". Чалавеку важна пачуць, што найперш ён каштоўны для краіны. А ёсць агрэсіўныя песні. І калі мы будзем спяваць "любі Беларусь" як загад, то патрэбнага эфекту не будзе.

— У новым сезоне ваша ўстанова прапануе ахвотным больш за два дзясяткі творчых аб'яднанняў. На якія ўзраставыя катэгорыі яны разлічаны?

— Мы заўсёды заклікаем бацькоў рабіць інвестыцыі ў сваіх дзяцей. Кошт заняткаў у творчым калектыве — гэта не тая сума, якую можна пакласці ў банк пад працэнты, а вось для будучыні дзяцей гэта важны ўнёсак. Неабходна, каб яны выхоўваліся ў творчым асяроддзі з маленства. І дзеля гэтага мы адкрылі і танцавальныя, і музычныя групы для дзяцей ад чатырох гадоў.

А самаму даросламу самадзейнаму артысту ў нашым цэнтры 84 гады. Дзякуючы бюджэтнаму фінансаванню мы маем магчымасць выконваць важную сацыяльную работу — весці калектывы для людзей сталага ўзросту. Гэта стратэгічна важнай дзейнасць. Калі чалавек выходзіць на пенсію, ён нібыта становіцца непатрэбным. А мы бачым, як бабулі і дзядулі збіраюцца на тых жа выставах клуба кветкаводаў, з гонарам дзеляцца дасягненнямі. Або нашы "Віцебскія дзяўчаты". Здаецца, удзельніцы зусім не юныя. Выходзяць на сцэну — і кожная як Майя Плісецкая! *(Усміхаецца)*. Мы атрымліваем вялікае задавальненне ад гэтага.

— Харэаграфія, вакал, тэатр, інструментальнае выканальніцтва... Кірункаў у вашым цэнтры безліч. Што з гэтага доўгага спіса можна лічыць сапраўдным эксклюзівам для Віцебска?

— Як прыклад, наш тэатр моды. Удзельнікі вучацца не толькі быць мадэлямі, яны асвойваюць поўны працэс ад канструявання і пашыву адзення да дэманстрацыі разам з кіраўніком Юліяй Куцепавай. Для гэтага мы закупілі сучаснае прафесійнае абсталяванне. Да таго выхаванцы шмат працуюць з нацыянальнай тэмай, ладзяць майстар-класы, а зараз рыхтуюць сумесны праект з кітайскімі студэнтамі на мяжы дзвюх культур.

Шырока вядомы наш моладзевы тэатр і яго студыя хадулістаў. Іх можна пабачыць літаральна на ўсіх гарадскіх імпрэзах. З першых дзён працы цэнтра існуе харэаграфічны калектыў "Лявоніха". Ёсць таксама інтэлектуальны клуб. Сапраўды, можна знайсці варыянт на любы густ.

— Магчымасць удзельнічаць у тым жа "Славянскім базары", напэўна, нівеліруе разрыў паміж самадзейнымі калектывамі цэнтра культуры і прафесійнымі ансамблямі. Ці сапраўды так?

— Як бы гэта нясціпла ні гучала, у нас працуюць лепшыя кіраўнікі. Магу казаць пра гэта ўпэўнена, бо па мінулай працы добра ведаю стан рэчаў у розных рэгіёнах.

У нашым цэнтры апантаныя людзі, якія адразу ствараюць прадукт, гатовы для сцэны амфітэатра. У іх за гады выпрацаваны такі падыход, што ў любы час яны могуць разгарнуць цэлае сцэнічнае палатно. І склалася такая практыка, што нашы калектывы заўсёды ў падрыхтоўцы да пэўнай імпрэзы. Працы "ў стол" няма. Барды ўдзельнічаюць у "Віцебскім лістападзе", без нашых гуртоў немагчыма ўявіць "Арт-Парад" — малодшага брата "Славянскага базару".

Да Новага года мы ствараем маштабныя мюзіклы, якія не саступаюць сталічным. Ёсць нават людзі, якія штогод адмыслова прыязджаюць дзеля іх у Віцебск.

Напрыканцы вясны ладзім справаздачныя канцэрты на вялікай сцэне з тысячнай залай. Акрамя таго, калектывы ўдзельнічаюць у карпаратыўных мерапрыемствах. Цэнтр культуры так уладкаваны, што мае вялікую долю пазабюджэту. І гэта пытанне развіцця калектываў.

Даніл ШЭЙКА
Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

“Нядзельнік” у Сёмкаве

Удзельнікі нядзельніка

Было

Стала

Сёлета архіў валанцёрскай дзейнасці газеты “Культура” папоўніўся дзясяткам новых запісаў. Суботнікі праводзіліся ў розных раёнах Мінскай, Гродзенскай і Брэсцкай абласцей. А ў нядзелю мы наведаліся ў прысталічны сядзібна-палацавы комплекс Сёмкава, у палац Хмараў, які нібы крыкам крычыць: “Дапамажыце! Ратуйце!” Анонс мерапрыемства быў размешчаны ў мінулым нумары “К”. А цяпер пра тое, як яно было.

ШПАЦЫР ПА ЭКАЛАГІЧНАЙ СЦЕЖЦЫ

Перш чым узяцца за працу, мы вырашылі прайсціся па знакамітай сёмкаўскай экасцяжыне, пра якую ўжо столькі разоў чулі, але яшчэ не бачылі. Даўжынёй яна каля аднаго кіламетра і праходзіць праз яблыневы сад, луг пры рацэ і стары прысядзібны парк. Уздоўж усяго маршрута ўсталявана сорак інфармацыйных стэндаў рознага памеру і зместу. На адных, невялічкіх, змешчаны выявы адметных паркавых раслін і тутэйшых птушак (іх галасы можна паслухаць на адмысловай інтэрнэт-старонцы, куды вядзе QR-код). Іншыя, большыя па памеры, распавядаюць пра гісторыю гэтага комплексу і пра славутых асоб, якія калісьці наведвалі ці працавалі ў Сёмкаве (прыкладам, Якуб Колас і Янка Купала). Да вельмі ўдалых знаходак можна аднесці стэнд у выглядзе мальберта, прысвечанага славутаму мастаку Напалеону Орду. Усталяваны ён на месцы, адкуль мастак у сярэдзіне XIX стагоддзя замаляваў Сёмкаўскі палац. Ёсць цікавыя стэнды і экалагічнай тэматыкі. Досвед, як мне падаецца, варты перайняння! Гэтая частка мерапрыемства прайшла пад знакам збору смецця ўздоўж сцяжыны.

ДЗВЕ ГАДЗІНЫ, ЯКІЯ МЯНЯЮЦЬ УСЁ

Уласна сам “нядзельнік” распачаўся а 12-й гадзіне на палацавым падворку. “Задача дня” была пастаўлена не надта амбітная — прыбраць кустоўе, якое панарасло ўздоўж падмуркаў палаца, а таксама ачысціць ад дрэў-самасеек і сумніку дзве цэнтральныя залі. І ў адведзеныя на гэту працу дзве гадзіны мы ўкляліся. Прычым не маючы ні трымераў, ні іншай, больш шумнай тэхнікі, з якімі можна было б здолець значна больш і за меншы прамежак часу. Выснову аб выніках нашай працы можна зрабіць па фотаздымках “да” і “пасля”. У “нядзельніку” ўзялі ўдзел сябры і чытачы нашай газеты — прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, мастацтвазнаўца **Яўген Шунейка**, магістр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта мастацтвазнаўца **Марыя Пастухова**, гісторык **Ілья Чарняўскі**. “Культуру” ж прадставілі стылістычны рэдактар **Мацвей Зайцаў** і аглядальнікі рэдакцыі **Данііл Шэйка** і аўтар гэтых радкоў.

ПРАЦЯГ МУСІЦЬ БЫЦЬ

Працы ў Сёмкава, па шчырасці, хапае. Прычым не толькі ў самім палацы. Вось што прыходзіць у галаву перадусім: варта вызваліць з палону зеляніны стары маляўнічы флігель праваруч ад палаца, бо ўлетку ён ледзь праглядаецца. Не лішне было б ачысціць ад хмызняку і прастору за палацам і колішнія сходы ў парк (які таксама патрабуе дагляду). Але такія касметычныя захады могуць пацешыць толькі турыстаў, паток якіх у Сёмкава расце дзень пры дні. Лёс жа самой гістарычнай перліны Міншчыны, помніка нацыянальнай значнасці, застаецца няпэўны.

Бібліятэчны падворак

Вынікі мастацкага пленэра

Восень у Завоссі

24 верасня ў Музеі-сядзібе Адама Міцкевіча, на гасціннай зямлі Баранавіччыны, прайшоў чарговы літаратурна-музычны фестываль “Восень у Завоссі”. Маштабнае свята сабрала некалькі сотняў гледачоў і ўдзельнікаў, у шэрагі якіх патрапілі і журналісты нашай газеты.

Свята, мэтай якога з'яўляецца папуляризацыя асобы і творчасці славутага паэта Адама Міцкевіча, мае доўгую гісторыю. Упершыню яно прайшло ў далёкім 2006 годзе. Але працяг адбыўся толькі ў 2018-м. Праўда, і далей сустракаліся перашкоды — у 2020-м урачыстасці адмяніла пандэмія. Таму сёлетні фестываль стаў чацвёртым па ліку. Як і ў мінулыя гады, у Завоссе з'ехаліся паэты і гісторыкі, спевакі і мастакі, было багата майстар-класаў і квестаў.

Арганізатарамі свята выступілі Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры, Баранавіцкі раённы выканаўчы камітэт пры падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Адным з галоўных і сталых партнёраў фестывалю з'яўляецца Баранавіцкая бібліятэчная сістэма і Навамышская бібліятэка імя Яна Чачота. Дарэчы, менавіта іх “Бібліятэчны падворак”, з густам арганізаваны дырэктарам бібліятэкі **Тацяанай Лайша** і яе калегамі, традыцыйна з'яўляецца адной з цэнтральных і насычаных падзеямі кропак свята. Сёлета тут выступілі паэты Святлана Танюкевіч і ўдзельнікі літаратурнага аб'яднання “Купальскія зоры” (кір. Тацяна Яцук), літаратары Саюза пісьменнікаў Беларусі: Алена Басікірская, Кацярына Роўда, Кацярына Стройлава, Тацяна Дземідовіч, Алена Папко, Раіса Раманчук, Тацяна Яцук, Зоя Кулік, Анатоль Бензярук. Аўтар гэтых радкоў выступіў з кароткім дакладам, які быў прысвечаны сузаснавальніку і архівісту таварыства філаматаў, сябру Адама Міцкевіча — Ануфрыю Петрашкевічу.

Для шматлікіх гасцей у сядзібе адна за другой праходзілі экскурсіі. Там жа адбыўся канцэрт “Светач веку залатога”, падчас якога гучалі песні на вершы Адама Міцкевіча і яго сяброў-філаматаў у выкананні салісткі Беларускай дзяржаўнай філармоніі, лаўрэата міжнародных конкурсаў Галіны Сакольнік і музыказнаўцы Святлены Немагай (фартэпіяна). Для аматараў гістарычнай анімацыі на сядзібным падворку быў разгорнуты “палявы лагер” вядомага рэканструктара Юрыя Усціновіча, у якім кожны мог паспрабаваць свае сілы ў рыцарскіх і шляхецкіх забаўках. Побач з рэканструктарамі ладзіўся мастацкі пленэр з удзелам навучэнцаў Навамышскай дзіцячай школы мастацтваў.

На галоўнай сцэне, якая сёлета была вынесена за межы сядзібнага падворка, адбыліся ўзнагароджанне пераможцаў дзіцячага творчага конкурсу “Там пакінуў я душы часціцу...”, прысвечанага творчасці А.Міцкевіча, выступленні народнага тэатра “На Мышанцы”, фолк-рок гурта “Тутэйшая шляхта”, арт-гурта “Беларусы”, канцэртная праграма калектываў мастацкай самадзейнасці Баранавіцкага раёна і пэтычныя чытанні творцаў Саюза пісьменнікаў.

Літаратурнае падарожжа, якое арганізаваў Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры, уключала ў сабе квест “Адамаў шлях пад вечным небам”, гульню-хадзілку “Звязка беларускіх казак”, лекцыю “Радавод Адама Міцкевіча і іншыя цікавосткі пра паэта” ад аўтара гэтых радкоў.

Працавала і выставапродаж вырабаў народнай творчасці рамеснікаў Баранавіцкага раёна.

Прыемна, што на фестывалі было шмат моладзі: і сярод удзельнікаў, і сярод актыўных гледачоў. У адным толькі квесце “Бібліятэчнага падворка” паўдзельнічала больш за сотню юных гледачоў, пераможцы якога атрымалі памятныя прызы ад Навамышскай бібліятэкі імя Яна Чачота.

Хочацца падзякаваць арганізатарам мерапрыемства за зладжаную працу па правядзенні свята і пазычыць фестывалю новых поспехаў!

Зміцер ЮРКЕВІЧ

Шлях сапраўднага талента заўсёды цярністы і складаны. Пацверджанне — дзясяткі твораў літаратуры і кінематографа. Гісторыя нашай гераіні Вольгі Булай — чарговы доказ небывалай чалавечай упартасці. Нарадзіўшыся ў маленькай вёсцы, дзяўчына атрымала прафесійную музычную адукацыю, адкрыла свой музычны цэнтр і стала пераможцай міжнароднага конкурсу.

Звілісты шлях да мары...

ЕЗДЗІЛА НА КАНІ Ў МУЗЫЧНУЮ ШКОЛУ

— З дзяцінства я ўжо марыла выступаць на сцэне. Памятаю, як глядзела канцэрты па тэлевізары, і гэта мяне зачароўвала. Калі была ў другім класе, педагог па музыцы сказала маёй маме: “Вашаму дзіцяці трэба спяваць, яна выдатна інтанае, чуе. Тэрмінова адводзьце яе ў музычную школу”. Але мы з бацькамі разумелі, што гэта практычна немагчыма. Музычная школа знаходзіцца ў раённым цэнтры — у горадзе Чашнікі, што ў дзесяці кіламетрах ад нашай вёскі Цяпіна. Заняткі ў ёй праходзяць тры разы на тыдзень. Машыны на той момант у нас не было, як даехаць да музычнай школы, як вучыцца сем гадоў — мы не ўяўлялі. Але тата адвёз мяне на праслухоўванне, якое я паспяхова прайшла. І потым паступіла ў падрыхтоўчы клас музычнай школы.

За сем гадоў навучання як я толькі ні дабіралася да музычнай школы! У нас быў конь Малыш, на ім тата падвозіў мяне. Калі было цёпла, я даязджала на ровары ці з настаўнікамі на спадарожных машынах. Маё жаданне і мэта займацца музыкай, выступаць на сцэне было наймацнейшай матывацыяй на той момант.

ПЛАНАВАЛА СТАЦЬ ЛЕКАРАМ

Нягледзячы на тое, што наша гераіня з юнацкага ўзросту займала толькі прызавыя месцы на ўсіх абласных і раённых конкурсах і паказвала выдатныя вынікі ў музычнай школе, яе бацькі былі настроены скептычна і раілі дзяўчыне выбраць больш сур'ёзную прафесію.

— Я паслухала маму і ўвесь дзясяты клас у школе вучыла хімію і біялогію, мэтанакіравана рыхтавалася паступаць у медыцынскі ўніверсітэт. І тут у дзясятым класе быў абвешчаны рэспубліканскі конкурс “Звонская раніца”, арганізатарам якога выступіла “Настаўніцкая газета”. У суседнім горадзе я прайшла кастынг, выйшла ў фінал, які праходзіў у НДЦ “Зубраня”. На той час гэта быў самы маштабны конкурс для мяне. Я заваявала Гран-пры і выйграла падарожжа ў Львоў. Пасля гэтага конкурсу дакладна ўсвядоміла: не змагу быць лекарам, таму што мая мара — спяваць. Калі абвясцілася сваё рашэнне бацькам, то яны адказалі: “Спрабуй!”

ПРАЦА ГАДУЕ

Пасля дзясятага класа Вольга паступіла ў Мінскі дзяржаўны каледж мастацтваў на эстраднае аддзяленне. Як успамінае сама спявачка, было шмат страхаў, бо на гэту спецыяльнасць заўсёды высокі конкурс. Хваляванне і тое, што наша гераіня з маленькай вёскі, а канкурэнцыю ёй складалі галоўным чынам мінчане.

— Каледж мастацтваў — сама галоўная музычная база, якую я атрымала. Там працуюць унікальныя педагогі, я да сёння ім вельмі ўдзячная. Лёс склаўся так, што сёлета сама выкладаю ў каледжы мастацтваў на эстрадным аддзяленні. А летась адкрыла свой музычны цэнтр для таго, каб прывіваць дзеткам любоў да музыкі і мастацтва.

ПРАЦА З ДЗЕЦЬМІ НАТХНЯЕ

У жыцці кожнага вялікага таленту ёсць пуцяводная зорка — настаўнік, які дапамагае скіраваць творчы патэнцыял у патрэбнае рэчышча. Для нашай гераіні такім чалавекам з'яўляецца Святлана Аляксандраўна Борахава, з якой Вольга даўтуль раіцца наконт музычнага матэрыялу і займаецца, бо лічыць, што ўсе дзейныя артысты павінны пастаянна падтрымліваць вакальную форму.

— На дадзены момант сама з'яўляюся педагогам, таму што вельмі крута не толькі выступаць на сцэне, але і перадаваць досвед дзецям. Для мяне гэта вельмі каштоўна. Насамрэч не кожны артыст выкладае. Некаторыя не хочуць дзяліцца нейкімі сваімі сакрэтнымі фішкамі ў выкананні. Але мая ўнікальнасць у тым, што я заўсёды з радасцю дзялюся сваімі ведамі.



Яркая таленавітая спявачка з вялікім амбіцыямі — так коратка можна апісаць нашу гераіню. Нягледзячы на звілісты шлях, Вольга працягвае заваёўваць беларускую эстраду і клапаціцца пра выхаванне творчай моладзі. А галоўнай крыніцай яе энергіі заўсёды застаецца музыка

Галоўная філасофія, якую імкнуся данесці да сваіх вучняў, — гэта быць сабой. Разумела, што кожны артыст павінен пераўвасабляцца, прапускаць праз сябе той ці іншы матэрыял. Але ў маім цэнтры навучаюцца дзеці да 14 гадоў, ім не раскажаш пра ўжыванне ў вобраз. Самае галоўнае — шчыра любіць тую справу, якой займаешся. Калі само дзіцё не хоча спяваць, а ёсць толькі жаданне бацькоў — я нават не бяруся з ім працаваць. Важна, каб у вучнях было імкненне, як некалі ў мяне. Памятаю, мама часта казала: “Цяжка табе дабірацца ў музычную школу, кінь ты гэтую справу”. Але я ведала і дакладна разумела, што мне трэба, у чым мая мэта. Такое ж усведамленне я прывіваю сваім вучням.

ПЕРАМОГА Ў КОНКУРСАХ І ГУЛЬНЯ БАЛАЎ

Сур'ёзная конкурсная дзейнасць Вольгі пачалася ў каледжы. На 3 курсе яна стала ўладальніцай Гран-пры Рэспубліканскага конкурсу эстрадных выканаўцаў “Белазаўскі акорд”, на 4 курсе — уладальніцай Гран-пры Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі ў Маладзечна, а таксама спецыяльнага прыза імя У. Мулявіна.

А ў верасні на міжнародным конкурсе выканаўцаў моладзевай песні, што стаў ключавой падзеяй фестывалю “Моладзь — за Саюзную дзяржаву”, дзяўчына заваявала першае месца.

— З самага дзяцінства я марыла быць прадстаўніком нашай краіны на сцэне Міжнароднага фестывалю мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску”. Двойчы спрабавала свае сілы ў нацыянальным адборы, два гады праходзіла ў дзясятку, але лёс распараджаўся так, што абіралі хлопцаў, якія апераджалі мяне літаральна на бал. Гэта трохі засмучала, але было стымулам ісці далей.

Сёлета я вырашыла паспрабаваць свае сілы ў фестывалі “Моладзь — за Саюзную дзяржаву”, які праходзіў на Смаленшчыне, і ў выніку перамагла. Лічу, што годна прадставіла сваю краіну. Перамога натхніла мяне на творчасць, напісанне сваіх песень, на тое, каб маю музыку чулі. Выступала на фэсце ад Маладзёжнага тэатра эстрады, у якім працую па кваліфікацыі “артыст”. Я выконвала кампазіцыі “Мой родны кут” на музыку І.Лучанка, вершы Я.Коласа і “Я цябе адваюю” на музыку І.Крутога, вершы М.Цвятаевай. Дзве песні, абсалютна розныя жанрава па дынаміцы і па гуку.

Падчас конкурсу ты лічыш, што крута выступіў, але ўсё залежыць ад журы. На першай песні яны толькі з табой знаёмяцца, уважліва слухаюць. Хоць я чакала, што будуць размаўляць паміж сабой, нешта абмяркоўваць. Але, калі ў час выканання другой кампазіцыі, на самым драматычным месцы, старшыня журы Аляксандр Ялоўскіх пачаў здымаць мяне на тэлефон, я зразумела: гэта поспех! Але наколькі поспех? Гэта гульня балаў. Было складана, таму што вынікі не абвяшчалі да 19 верасня. Мы выступілі 16-га і тры дні былі ў няведанні.

УЗАРВАЦЬ ЮЦЬЮБ І САБРАЦЬ ТЫСЯЧЫ ПРАГЛЯДАЎ

У рэпертуары Вольгі ёсць і ўласныя песні, пра першую з іх гераіня распавядае:

— Кампазіцыя называецца “Простая кава” на музыку і вершы Валерыя Шмата. Я палічыла, што першая песня для беларускага артыста павінна быць на роднай мове. Наступная — “Адпускаю” — напісана Ганнай Благавай, аранжыроўка Паўла Беразоўскага. Гэтая песня ўзарвала Ютьюб і сабрала сто тысяч праглядаў. Неўзабаве выходзіць трэцяя песня, “Веру табе”, над якой таксама працавалі Ганна Благава і Павел Беразоўскі.

Дарэчы, пра планы на будучыню: хочацца стварыць сваю музыку для таго, каб дзяліцца са слухачамі пачуццямі і перажываннямі. Аддаваць сябе аўдыторыі — для артыста самае важнае. Гэтак і складаецца ў маім жыцці — я спяваю пра тое, што адчуваю, і гэта знаходзіць водгук у сэрцах людзей.

Настасся ЮРКЕВІЧ

КУЛЬТУРА / KULTURA-INFO.BY
№ 40 / 1 КАСТРЫЧНІКА 2022 г.

КУЛЬТУРА / KULTURA-INFO.BY
№ 40 / 1 КАСТРЫЧНІКА 2022 г.

Музычная “Душа...” Марка Шагала

Юбілейны, 85-ы сезон Беларускай дзяржаўнай філармоніі адкрыла сусветная прэм’ера сюіты “Душа над горадам” Галіны Гарэлавай у выкананні Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра нашай краіны.

Гэта не першая партытура знанага беларускага кампазітара, прысвечаная Марку Шагалу. Восем гадоў таму той жа аркестр на чале з Аляксандрам Анісімавым прэзентаваў “Страсці па Марку” Галіны Гарэлавай. Твор спалучаў жанравыя абрысы рэлігійных страсцей, вядомых па творчасці І.С.Баха, і санатна-сімфанічнага цыкла. Кожная з сямі яго частак (“Душа горада”, “Падзенне Ікара”, “Скрыпач”, “Вершнік”, “Жоўтае распяцце”, “Музыканты”, “Над горадам”) была звязана з пэўнай карцінай сусветна прызнанага мастака з Віцебска (гл. “Мастацтва № 10 за 2014 г.).

Цяперашняя сюіта, нягледзячы на знешні працяг тэмы, — зусім іншая. Кампазітару замовілі балет пра Шагала. Музыку Гарэлава сачыніла, ды пастаноўка не ажыццявілася. Студыйны запіс партытуры быў зроблены на радыё пад кіраўніцтвам усё таго ж А. Анісімава. У радыёэфір выйшла амаль гадзінная праграма, падрыхтаваная Віктарам Кісцянём, дзе размова з кампазітарам перамяжалася сімфанічнымі фрагментамі. І вось, нарэшце, адбылася публічная сусветная прэм’ера — не ўсёй музыкі балета, а толькі складзеных у сюіту асобных яе частак, дзе кожная з іх мела назву: “Віцебск (Містычны горад Шагала)”, “Ідылія (Віцебскае мястэчка)”, “Фрэйлэхс”, “Пажар”, “Інтэрмедыя (Віцебск: ХХ стагоддзе пачынаецца)”, “Сон Бэлы”, “У цудоўным і лютым свеце (Маладыя мастакі Віцебска)”, “Развітанне. Сны пра Віцебск”. Але ж музыка атрымалася настолькі яркай, вобразнай, што зразумець яе сэнс можна было і без дадатковых тлумачэнняў.

У параўнанні са “Страсцямі па Марку”, стылёвай асаблівасцю “Душы над горадам” сталі яшчэ больш ярка выяўленыя нацыянальныя рысы яўрэйскай музыкі. Калі ў ранейшым творы яны былі часцяком прыхаваныя і напоўніцу асэнсоўваліся хіба праз навуковыя даследаванні кандыдата мастацтвазнаўства Алёны Лісавай і маладой музыказнаўцы Святланы Воранавай, дык у гэтай партытуры сталі відавочныя абсалютна ўсім. Справа не толькі ў пранікнёным сола скрыпкі (салістка — канцэртмайстар Юлія Стэфановіч), што лунае ў паветры першай і апошняй частак, ці ў сола кларнета — яшчэ аднаго любімага ў яўрэйскай культуры музычнага інструмента. І не толькі ў звароце да характэрнай інтанацыйнасці, рытмікі, нават жанру папулярнага ашкеназскага вясельнага танца — фрэйлэхс. Кампазітар цудоўна перадала дух, унутраную сутнасць самога характару шматпакутнага народа, адлюстравала жыццё мястэчка, дала яскравы музычны “партрэт” Віцебска стогадовай даўніны.

Галіна Гарэлава

З гэтым горадам яна знаёмая не завочна. І вывучала яго не па турыстычных мапах ці экскурсійных турах “усім натоўпам”. Яшчэ ў гады юнацтва яна ездзіла туды са сваім кіраўніком асістэнтуры-стажыроўкі — народным артыстам Беларусі і СССР, прафесарам Анатолем Багатыровым. Той паказваў ёй горад свайго дзяцінства, якім ён яго запомніў яшчэ да ўсіх далейшых перабудоў і разбурэнняў, раскрываў шматлікія таямніцы, дзяліўся ўражаннямі ад частых наведванняў сям’і Шагалаў, куды бацькі адпраўлялі яго па суботах — дапамагаць па гаспадарцы ў гэты святы для іўдзеяў дзень шабата, калі яны не могуць працаваць, каб не парушыць законы Торы. Пра ўсё гэта і многае іншае Г. Гарэлава распавядала “Культуры” яшчэ напярэдадні прэм’еры “Страсцей па Марку” (гл. “К” № 35 за 2014 г.). І той досвед вельмі дапамог ёй пры рабоце над балетам.

Але ж пры ўсёй сваёй яўрэйскай скіраванасці і адпаведнасці жыццю і творчасці М. Шагала “Душа над горадам” атрымалася яшчэ і вельмі гарэлаўскай. Ведаючы музыку кампазітара, нават без аб’яўлення яе імя памыліцца ў аўтарстве немагчыма. Бо новая сюіта нябачнымі ніцямі звязаная з многімі іншымі творамі Галіны Гарэлавай. Званы, што абрамляюць цяперашнюю партытуру, перагукаюцца з яе Канцэртам для гітары. Урбанізацыя Віцебска — з фартэпіянным цыклам “Музыка горада”, п’есамі “Гукі вуліц”, “Графіці”. А выдатнае выкананне сюіты філарманічным аркестрам на чале з народным артыстам Беларусі, прафесарам А. Анісімавым працягнула “беларускія старонкі” ў творчасці знакамітага дырыжора, які падобным канцэртным выкананнем данёс да публікі музыку не аднаго сцэнічна не ўвасобленага айчыннага балета.

Надзея БУНЦЭВІЧ

"Вясновы дзень 30 красавіка"

Госці з Калугі

15-ы раз гастраляваў у Беларусі Калужскі ТЮГ. Прычым гэта былі абменныя гастролі: тымі ж вераснёўскімі днямі артысты нашага ТЮГа выходзілі на калужскую сцэну.

— Мы ганарымся тым, што ў нас так добра наладжаны кантакты з Беларуссю, — пракаментавала гастрольны тур дырэктар Калужскага ТЮГа **Валерыя Візгава**. — Выступаць тут — вялікі гонар для нас, мы заўжды хвалюемся, бо прадстаўляем сваю краіну ў замежжы. Дарэчы, на восень запланаваны таксама паказ нашых спектакляў на яшчэ дзвюх беларускіх сцэнах. У прыватнасці, у Магілёўскім абласным тэатры лялек пройдзе казка “Іван Царэвіч і Шэры Воўк”, а ў Бабруйску мы пакажам “Пікавую даму”. Для цяперашніх жа сталічных гастроляў, акрамя “...Шэрага Ваўка”, быў абраны “Вясновы дзень 30 красавіка” — спектакль пра апошнія дні Вялікай Айчыннай.

Дададзім, што гэта не адзіная пастаноўка калектыву на героіка-патрыятычную тэму. Тры гады таму калужане прывозілі ў той жа Бабруйск, на Рэспубліканскі фестываль нацыянальнай драматургіі, сваю сцэнічную версію вядомай п’есы Аляксея Дударава “Не пакідай мяне...”. Тэатр свядома працуе выключна ў рэалістычнай манеры, што пацвердзілі і цяперашнія гастролі.

Асаблівасцю “Вясновага дня...” стала рознабаковае ўвасабленне немцаў. Сярод якіх вылучаліся і фанатычна адданыя фюрару фашысты, і прызваныя абараняць Берлін учарашнія школьнікі-падлеткі, што сталі ахвярай гітлераўскай прапаганды, і мірнае насельніцтва Германіі, якое таксама пакутуе ад ваенных дзеянняў. У цэнтры аповеду аказаліся не толькі гераічныя ўчынкі савецкіх людзей, але і тэма няпростага выбару, што стаяў перад немцамі, асэнсаванне імі наступстваў развязанай вайны.

Абодва гастрольныя спектаклі ставіў галоўны рэжысёр Калужскага ТЮГа **Міхал Візгаў**, які больш за трыццаціголдзе ўзначальвае калектыў. Спектакль “Іван Царэвіч і Шэры Воўк” па п’есе Ф.Ражкова, напісанай паводле рускай народнай казкі, вабіў цікавымі сцэнічнымі строямі, асабліва Жар-птушкі, спалучэннем танцавальнага фальклору з сучаснай пластыкай. Смех у зале выклікалі спробы ўсталявання сігналізацыі для аховы залатой яблынькі. А вось некаторыя сюжэтныя павароты вымушалі згадаць дзядулю Фрэйда і найноўшыя псіхалагічныя распрацоўкі падсвядомага фарміравання сцэнарыяў чалавечага жыцця пад уздзеяннем любімых у дзяцінстве казак. Да прыкладу, бацька, што дасылае сыноў на магчымую смерць дзеля ўласнай прыхамаці — жадання мець Жар-птушку. Ці бацькоўскія маніпуляцыі ў адносінах да малодшага сына, якога ён бачыць “вечным дзіцяткам”. Тэма ахвярнасці, калі праблемы галоўнага героя, што ўзнікаюць часцяком па яго ўласнай віне, павінны вырашаць усе навакольныя.

Кожны гастрольны спектакль папярэджваўся эмацыянальным уступным словам дырэктара В.Візгавай, суправаджаўся каляровымі флаерамі (у тым ліку са згадкамі анлайн-паказаў калужскага тэатра), а завяршаўся фотасесіяй юных гледачоў з улюбёнымі героямі.

Надзея БУНЦЭВІЧ

"Іван Царэвіч і Шэры Воўк"

СТУЖКА ЖЫЦЦЯ

АЎТОГРАФ З БЕЛАРУСКАЙ ЗЯМЛІ



...мунт Мінейка
...1925 гг.

...грэчаскі грамадскі і ваенны дзеяч, навуковец, этнограф.

Зыгмунт Мінейка быў высокаадукаваным чалавекам, ведаў польскую, літоўскую, рускую, французскую, турэцкую, грэчаскую мовы. Быў добрым вершнікам і танцорам. Акрамя гэтага, з'яўляўся выдатным масонам, на яго пахаванне ў Афінах прыехалі тысячы масонаў.

Імя Мінейкі носіць вуліца ў Ашмянах. Яго асоба ўзгадваецца ў рамане Тадэвуша Канвіцкага "Польскі комплекс" (1977). У 2017 годзе з польскага выдання 1971 г. на беларускую мову былі перакладзены ягоныя ўспаміны.

На схіле жыцця Мінейка думаў аб вяртанні на радзіму і аб арганізацыі археалагічнай экспедыцыі ў Грэцыю, аднак не паспеў ажыццявіць гэтыя задумы. Сярод яго нашчадкаў ёсць выдатныя палітычныя дзеячы. У прыватнасці, унук Андрэас Папандрэу і праўнук Георгіас Папандрэу былі прэм'ер-міністрамі Грэцыі.

1840 г.
Нарадзіўся ў в. Балваніцкі Ашмянскага павета (цяпер в. Зялёны Бор) у шляхецкай сям'і, старажытны радавод якой бярэ пачатак яшчэ з часоў ВКЛ.

Францішак Багушэвіч

1852 — 1858 гг.
Вучыцца ў Віленскай гімназіі разам з яшчэ адным выбітным беларусам Францішкам Багушэвічам.

Зыгмунт Мінейка (першы злева) падчас адкрыцця першых Алімпійскіх гульняў

Мінейка падчас навучання ў Мікалаеўскім інжынерным вучылішчы

1858 г.
Паступае ў Мікалаеўскае інжынернае вучылішча ў Санкт-Пецярбургу.

1861 г.
Вяртаецца ў Беларусь, каб далучыцца да вызваленчага руху. Пераапранаецца ў селяніна і распаўсюджвае па вёсках "Гутарку старога дзеда".

"Гутарка старога дзеда" — беларускі ананімны вершаваны агітацыйны твор XIX стагоддзя. У навуковай літаратуры аўтарам гутаркі называлі Вінцэся Каратынскага, Уладзіслава Сыракомлю, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.

Вымушана выязджае ў Італію, дзе паступае ў Польскую вайсковую школу Джузэпэ Гарыбальдзі ў Генуі. Пазней чытае там лекцыі аб ваенных умацаваннях.

1863 — 1865 гг.
18 сакавіка пад кіраўніцтвам Мар'яна Лангевіча ўзяў удзел у бітве пад Грахоўіскамі, пасля стаў камандзірам атрада паўстанцаў Ашмянскага павета, дзе і быў разбіты падчас першай бітвы 3 чэрвеня.

Пасля паражэння быў арыштаваны і пасаджаны ў віленскі астрог, дзе атрымаў смяротны прысуд. Дзякуючы намаганням роднай маці і падкупу генералаў Весялецкага і Мураўёва, пакаранне было зменена на 12 гадоў катаргі ў Сібіры.

По дарозе на Сібірскія руднікі Мінейка выдаў сябе за памерлага сябра па прозвішчы Струміла, які быў прысуджаны толькі да вольнага пасялішча. Дзякуючы гэтай хітрасці Зыгмунт застаўся ў Томску, дзе пачаў гандляваць, вырабляючы шапкі, падушкі і штучныя кветкі. На заробленыя грошы набыў вазы, коней і ўцёк у Санкт-Пецярбург, адкуль з'ехаў у Заходнюю Еўропу, узяўшы прозвішча графа фон Мэбэрта.

1865 — 1868 гг.
Некалькі месяцаў жыве ў Нідэрландах, пасля пераязджае ў Францыю, дзе навучаецца ў ваеннай школе пры парыжскай Акадэміі генеральнага штаба і атрымлівае званне капітана французскай арміі.

1870 г.
Удзельнічае ў франка-прускай вайне, быў сярод абаронцаў Парыжскай камуны.

Пасля вайны перабіраецца спачатку ў Турцыю, потым у Грэцыю, дзе атрымлівае пасаду галоўнага інжынера правінцый Эпір і Фесалія і займаецца будаўніцтвам чыгункі, мастоў, пракладаннем каналаў у Балгарыі, Турэччыне і Грэцыі.

1874 г.
Ажаніўся з грачанкай Празэрпінай Манарыс. У шлюбе нарадзілася сямёра дзяцей.

1876 — 1880 гг.
Займаецца археалагічнымі раскопкамі ў г. Дадоне, дзе праз два гады знаходзіць легендарны храм Зеўса. Піша шматлікія работы па тапаграфіі, складае этналагічную карту Эпіра.

1910 гг.
За выбітныя заслугі перад краінай парламент прысвоіў Мінейку званне ганаровага грамадзяніна Грэцыі.

1891 — 1896 гг.
Разам з сям'ёй перабіраецца ў Афіны, дзе ўзначальвае дэпартамент пры Міністэрстве публічных работ Грэцыі. Падчас падрыхтоўкі да першых Алімпійскіх гульняў прымае ўдзел у будаўніцтве і ўзнаўленні алімпійскіх аб'ектаў. Узначальвае рэстаўрацыю Панацінаікоса — легендарнага Мармуровага Алімпійскага стадыёна, а калі праходзіла сама алімпіяда, быў спартовым карэспандэнтам польскіх газет "Dziennik Polski" і "Czas".

1911 гг.
Упершыню пасля ўцёкаў з Сібіры здзейсніў падарожжа на Радзіму. Наведаў Балваніцкі, Ашмяны, Гальшаны, Вільню. Землякі аказалі яму цёплы прыём, аднак, баючыся арышту царскімі ўладамі, Мінейка вярнуўся ў Грэцыю.

1921 — 1923 гг.
Удзельнічаў у грэка-турэцкіх войнах. Распрацаваў стратэгію штурму Салонікаў і крэпасці Яніна, якая забяспечыла перамогу грэчаскай арміі. Працаваў у дзяржаўнай адміністрацыі, быў кіраўніком інжынернага аддзела грэчаскай арміі. Быў узнагароджаны ордэнам Залатога Крыжа. Пачаў пісаць мемуары.

1925 г.
Памёр 27 снежня ў Афінах ад сардэчнага прыступу. Яму было 85 гадоў. У апошні шлях яго праводзіла шматтысячная працэсія, у якой былі людзі з дзясяткаў краін свету.

1921 — 1923 гг.
Зыгмунт Мінейка зноў наведвае родныя мясціны і Польшчу. У Вільні перадае Універсітэту Стэфана Баторыя багатую нумізматычную калекцыю, а Ягелонскай бібліятэцы ў Кракаве — 50 тамоў сваіх рукапісаў.

КУЛЬТУРА / KULTURA-INFO.BY
№ 40 / 1 КАСТРЫЧНІКА 2022 г.

Перагарнуўшы вераснёўскія старонкі календара, а з імі і апошнія лісты рэдакцыйнай пошты, адзначаем: восеньская пара, як і ўжо, на жаль, мінулая летняя, такая ж багатая на мерапрыемствы, якія ладзяцца супрацоўнікамі сферы культуры ў розных рэгіёнах Беларусі. Менавіта з гэтай прычыны "Люднае месца" пастаянна поўніцца вашымі навінамі, шаноўныя чытачы. Пра шматлікія і адметныя культурныя акцыі, што адбыліся на мінулым тыдні, пагаворым больш падрабязна.

На фота:
1, 6. Падчас правядзення Гальшанскага кірмашу.
2. На свяце ў Мажэйкаве можна было пакаштаваць напоі на любы густ.
3. Вучні Ашмянскай дзіцячай школы мастацтваў.
4. Семінар-стажыроўка ў Оршы: сучасныя падыходы культурна-дасугавай дзейнасці.
5. Майстар-клас у Хоцімскім РДР зацікавіў падлеткаў.

Сакрэты восеньскіх імпрэзаў, або Каго жывіць жывіца?

ЖАРТЫ З ЧАРОЎНАГА РОГА

Лагодным нядзельным вечарам для жыхароў **аграгарадка Гальшаны**, што ў **Ашмянскім раёне** Гродзенскай вобласці, быў зладжаны восеньскі кірмаш, які стаўся сапраўдным святам для жыхароў. Перад аднавяскоўцамі выступіў узорны інструментальны ансамбль "Мелодыка". Таксама была прэзентавана тэатралізаваная імпрэза, у героях якой многія з прысутных пазналі сябе. "*Дасцінныя жарты, безгіч прыказак і прымавак, трапныя афарызмы — усё гэта, быццам з чароўнага рога, лілося са сцэны і спрыяла стварэнню цёплай і душэўнай атмасферы*", — піша аўтар ліста Марта Багдановіч.

Таксама для наведвальнікаў была зладжана займальная конкурсная праграма, якая, як пераканана Марта, спрыяла раскрыццю творчага патэнцыялу, спрыту і пачуцця гумару гледачоў. А яшчэ на кірмашы працавала шмат гандлёвых пунктаў, дзе кожны мог знайсці сабе ўпадабаны тавар на любы густ і кашалёк.

Адметную імпрэзу зладзілі і ў **аграгарадку Жухавічы**, што ў **Карэліцкім раёне** Гродзенскай вобласці. Тут у мінулыя выхадныя адкрыўся "Жухавіцкі Mabon-fest". Як піша аўтар допісу Кацярына Куканава, на свяце працавалі разнастайныя пляцоўкі, сярод якіх гульнявая пад назвай "Карнавал гульняў" ды кулінарная "Пальчыкі аблізаш". Ладзіліся шматлікія конкурсы, шумелі гандлёвыя рады ды вуліца майстроў, дзе можна было ўбачыць розныя вырабы ручной работы. А святочны канцэрт ад супрацоўнікаў Ярэміцкага сельскага Дома культуры нікога не пакінуў абыякавым.

АД СЕМІНАРА ДА ЭКСКУРСІІ

Натуральна, у рэгіёнах Беларусі ладзяцца не толькі фестывалі. Так, 23 верасня ў **Оршы** прайшоў семінар-стажыроўка "Сучасныя падыходы культурна-дасугавай дзейнасці ва ўстановах культуры Магілёўскай вобласці. Традыцыі народных песень і іх перамнасць". Работнікі сферы культуры **Аршанскага раёна** пераймалі вопыт работы **Магілёўскага** абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветнай работы.

Як паведамляе вядучы рэдактар Магілёўскага АМЦНТіКАР Крысціна Башарымава, на семінары ішла гаворка не толькі пра практыку захавання традыцыйнай народнай культуры, неўчых традыцый вобласці, але і былі зладжаны майстар-класы па вакальна-харавым і фальклорным мастацтве ды адбылося навучанне па лозапляценні і спіральным пляценні з пухоўкі, шыцці саламянага картуза, вырабе сувенірных валёнкаў. Таму можна не сумнявацца, што семінар-стажыроўка пасадзейнічае павышэнню прафесійнага вопыту ды наладжванню творчых кантактаў паміж работнікамі сферы культуры розных рэгіёнаў Беларусі.

Напрыканцы верасня **Хоцімскі** раённы Дом рамёстваў наведалі навучэнцы першай сярэдняй школы гарадскога пасёлка. Для іх майстар-клас па ткацтве правяла член Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, народны майстар Рэспублікі Беларусь Таццяна Іванаўна Кавалёва. Як адзначае дырэктар Хоцімскага РДР Марыя Джавукцян, Таццяна Кавалёва паказала і расказала дзецям, з чаго складаецца ткацкі станок, як нацягваюцца ніткі, як робіцца ўзор, а потым падлеткі самі з вялікім задавальненнем паспрабавалі сябе ў ролі ткачоў.

А намеснік дырэктара **Ашмянскай** дзіцячай школы мастацтваў Таццяна Пячкур расказала ў сваім лісце, што днямі навучэнцы ўстановы наведалі Вязынку — малую радзіму Янкі Купалы. Дзеці пабывалі ў музеі Песняра і паспрабавалі адлюстраваць на сваіх вучнёўскіх палотнах яркія моманты вандроўкі ў мясціны, родныя для паэта.

ЗЛАБАДЗЁННЫЯ ПЫТАННІ

Нехта мо і не ведае, а 22 верасня па ўсёй краіне праходзіў адзіны дзень бяспекі. З гэтай нагоды ў **Астравецкай** раённай бібліятэцы, як паведаміла бібліятэкар Вольга Заянчкоўская, прайшла сустрэча калектыву ўстановы культуры з начальнікам раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Віталём Рыбаком, які нагадаў пра важнасць датрымання правіл пажарнай бяспекі на працы і дома.

У той жа дзень аддзел па працы з дзецьмі Палаца мастацтваў **Бабруйска** зладзіў дыскусію "Вэйпінг і курэнне. Папулярныя памылкі" для навучэнцаў гарадской сярэдняй школы № 28. Падчас мерапрыемства вядучая разам з дзецьмі і запрошаным інструктарам-валеолагам гарадской цэнтральнай бальніцы пагаварылі аб прычынах курэння ў падлеткавым узросце, відах цыгарэт і іх шкодзе. Таксама ў гэтай жа ўстанове ладзілася прафілактычная гутарка "Папярэджаны — узброены" па прафілактыцы ВІЧ-інфекцыі для навучэнцаў гарадской сярэдняй школы № 8.

А НА ДЭСЕРТ — ВІНШАВАННІ

21 верасня ў **Лідскай** раённай бібліятэцы імя Янкі Купалы ладзілася прэзентацыя кнігі "Даверлівы дыялог" мясцовай паэткі Ірыны Маркевіч. Як адзначае загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Дар'я Марцінкевіч, *"прэзентаваная кніга самабытная і непаўторная, а аўтар мае свой голас, свой почырк, падуладны толькі дару выключнай сілы"*. З выданнем зборніка Ірыну Маркевіч прыйшлі павіншаваць калегі — удзельнікі літаб'яднання "Суквецце". Увазе прысутных быў таксама прадстаўлены буктрэйлер па кнізе паэткі, падрыхтаваны аддзелам бібліятэчнага маркетынгу ўстановы.

І апошняе. Як вядома, традыцыйна бібліятэкі Беларусі прымаюць удзел у рэспубліканскім конкурсе "Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры". Дык вось, як паведаміла нам бібліятэкар **Астравецкай** раённай бібліятэкі Вольга Заянчкоўская, на сёлетнім конкурсе **Міхалішкаўская сельская бібліятэка** была ўзнагароджана дыпломам I ступені ў намінацыі "За падтрымку і папулярызацыю чытання". Віншуем супрацоўнікаў бібліятэкі з заслужанай узнагародай і зычым новых поспехаў усім нашым чытачам!

Беражыце сябе, шаноўныя! Сустрэнемся праз тыдзень.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

КУЛЬТУРА / KULTURA-INFO.BY
№ 40 / 1 КАСТРЫЧНІКА 2022 г.

Птушка-абярэг выбрала сталіцу

Сямнаццаць дзён спатрэбілася нашай чытачцы, каб злавіць птушку шчасця: **Кацярына Дамарад** першай разгадала крыжаванку, надрукаваную ў газеце "Культура" (№36 ад 03.09.2022 г.), што стала нечаканасцю не толькі для пераможцы, а таксама і для нас. Але 28 верасня яна атрымала птушку-абярэг. Фаварытамі ў гэтым чытацкім спаборніцтве мы лічылі, вядома ж, бібліятэкараў, якія старанна захоўваюць падшыўкі выданняў. Але прыз ад "Культуры" дастаўся прадстаўніку іншай галіны. Кацярыне Дамарад 40 гадоў, жыве ў Мінску, працуе ў сферы сувязі больш за 20 гадоў, але цяпер знаходзіцца ў дэкрэтным адпачынку. У Кацярыны двое дзетак: дачка Варвара і сын Канстанцін. Вось што расказала пераможца з нагоды разгадвання крыжаванкі.

— Газету "Культура" выпадкова ў мяне забыла сяброўка, якая прыязджала на каву. Яна працуе ў бібліятэцы. А ў мяне цяпер больш вольнага часу, таму я ўважліва прагледзела нумар і зацікавілася крыжаванкай. Некаторыя словы я "гугліла", але большасць адказаў мне вядомыя, такія як "хлеб", "бочка", "Беларусьфільм"... Таксама мне дапамагала сяброўка, якая прынесла яшчэ пару жнівеньскіх нумароў газеты "Культура".

Рэдакцыя віншуе Кацярыну з перамогай і публікуе новае заданне. Нагадваем, што крыжаванка фарміруецца па нумарах газеты за мінулы месяц.

Фота запоўненай крыжаванкі дасылайце да 22 кастрычніка на адрас: **reklama@kultura-info.by.**

Імя пераможцы, дакладныя адказы і новае заданне будуць апублікаваныя 5 лістапада.

Цімафей КАРПІНЧИК

Тэхналогія вырабу шчаслівай птушкі занесена ў Спіс нематэрыяльных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь у 2016 годзе.

Кацярына Дамарад:

"Я люблю слухаць разнастайную музыку. Наогул кажучы, я асоба творчая: хачу — твару, а хачу — вытвараю."

Адказы на крыжаванку, змешчаную ў №36 ад 03.09.2022

Па гарызанталі:
1.Зажынкі. 2.Таржкі. 4.Форум. 6.Сянно. 9.Тры. 10.Смаленск. 12.Дарога. 14.Залюстроўе. 16.Хлеб. 21.Брава. 22.Казань. 24.Цадкін. 25.Скачко. 26.Гродзеншчына. 28.Зорка. 30.Прыпяцкі. 31.Клубок. 33.Люлечка. 34.Талент. 36.Песня. 37.Беларусьфільм. 39.Рыбалка. 40.Сошум. 44.Каравай. 47.Гістарыёграф.

Па вертыкалі:
3.Нясвіж. 5.Артыст. 7.Жнівень. 8.Бочка. 11.Жывапіс. 13.Светагор. 15.Сэлфі. 17.Лістапад. 18.Сенакосы. 19.Юркевіч. 20.Беларусь. 23.Рамеснік. 25.Смольня. 27.Аватарка. 29.Кантрамарка. 32.Карнавал. 35.Бібліятэка. 38.Лясківічы. 41.Блікер. 42.Цырк. 43. Глечык. 45.Прыгажосць. 46.Дубай. 48.Сухадольскі

Па гарызанталі:

1. Серыял, дзе актрыса Дар'я Атрошка сыграла маленькую Вангу.
2. Горад, вядомы з XVI стагоддзя, у якім сёлета праходзіў Дзень беларускага пісьменства.
5. Прыз ад рэдакцыі газеты "Культура" пераможцу за разгадванне крыжаванкі.
6. Замкавы комплекс у Карэліцкім раёне.
9. Месца пад Мінскам, дзе знаходзіцца Музей беларускага народнага мастацтва.
11. Сёлета гэтаму народнаму пісьменніку, класіку беларускай літаратуры, устаноўлены помнік у Добрушы.
12. Аглядальнік рэдакцыі газеты "Культура" з імем Данііл.
13. Гэтай гароднінай можна было атрымаць па патыліцы падчас свята, якое ў верасні прайшло ў Іўі.
14. Частка нашых кнігі Якуба Міско "Маё маўклівае ...".
20. Выдатны музыкант, дырыжор, адзін з найбуйнейшых еўрапейскіх кампазітараў XIX стагоддзя.
21. Заслужаны калектыў, Беларускі тэатр з Віцебска.
23. Прозвішча начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама.
24. Маладая пісьменніца, пераможца II Літаратурнага конкурсу "LitUp", які зладзіла Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
26. Сусветна вядомы мастак, прадстаўнік абстрактнага экспрэсіянізму, адзін са стваральнікаў жывапісу каляровага поля, які нарадзіўся 25 верасня 1903 года ў Дзвінску Віцебскай губерні.
27. Мясцовасць удалечыні ад буйных цэнтраў.
28. Расійскі горад, які прыняў першы Міжнародны форум дзіцячай творчасці, дзе ў жніўні пабывала і дэлегацыя з Беларусі.
29. Прозвішча кіраўніка Заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь "Тэатр эстраднай песні "Сябрынка" Палаца культуры МАЗ".
32. Аграгарадок на Брэстчыне, вядомы фестывалем гумару, полькай і рыбай, якую гатуюць у печы.
34. Горад у Беларусі, які сёлета адзначыў 955-гадовы юбілей.
35. Гэтая гародніна зʼяўляецца асновай абраду, які праводзяць у Іванаўскім сельскім Доме культуры. А яшчэ яна ферментуецца з гуркамі і квасіцца.
36. Спектакль, які Нацыянальны акадэмічны драмтэатр імя Якуба Коласа прадставіў на гастролях у Гомельскім гарадскім маладзёжным тэатры.
39. У гэтага віду мастацтва нямала жанраў. Адзін з іх дакументальны.
41. Назва гарадзішча, дзе наступным летам пройдуць маштабныя работы.
43. Выдавецтва, у якім выйшла кніга Якуба Міско "Маё маўклівае сэрца".
44. Адукацыйнае мерапрыемства, якое Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь правёў 1 верасня ў Палацы Незалежнасці.
46. Горад у Мінскай вобласці, дзе дзіцячая школа мастацтваў носіць імя Анатоля Аляксандравіча Анікейчыка.
47. Кніга якая стала вынікам шматлікіх падарожжаў па краіне фатографа Сяргея Лескеця пра свет беларускіх шаптух.

Па вертыкалі:

3. Муза трагедыі.
4. Грашовая ўзнагарода, якую можна атрымаць за перамогу ў конкурсе Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі ў галіне літаратуры, мастацтва, журналістыкі і аматарскай творчасці.
7. Беларускі і савецкі мастак, майстар пейзажнага жанру і нацюрморта, педагог, член Саюза мастакоў СССР.
8. У гэтай вёсцы Бярозаўскага раёна знаходзіцца этнаграфічны музей, дзе захоўваюцца ўнікальныя шалі эпохі дынастыі Пуслоўскіх, а таксама "чаравікі-румынкі", якім больш за 100 гадоў.
10. Жыхарам гэтай вёскі Якуб Колас у сталыя гады жыцця адрасаваў ліст.
15. Яна бывае абʼектыўнай, паралельнай, віртуальнай.
16. Горад, дзе знаходзіцца Палескі драматычны тэатр.
17. Народны тэатр лялек, які ў 2016 годзе стаў пераможцам II Адкрытага рэгіянальнага фестывалю "Чароўны свет Батлейкі".
18. Прозвішча легендарнага даследчыка, які "вымераў" усе нашы сядзібы сваімі нагамі.
19. На што падобны будынак Нацыянальнай бібліятэкі?
22. Згодна з ёй насельніцтва Беларусі давярае органам улады.
25. Страва нацыянальнай кухні, якая атрымала статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці Беларусі.
28. Яна — за вечары дружбы, конкурсы, выязныя канцэрты, спартыўныя спаборніцтвы, турыстычныя злёты.
30. Самая рэкламная рубрыка ў газеце "Культура".
31. Столькі гадоў сёлета споўнілася Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.
32. Населены пункт, у якім у верасні прайшоў першы пленэр на руінах рэзідэнцыі апошняга мінскага ваяводы Адама Хмары.
33. Вядучая музычная навучальная ўстанова краіны, якая сёлета адзначыць 90 гадоў з дня заснавання.
37. Прозвішча мастака пачатку XIX стагоддзя, аўтара карціны, на якой намаляваны Міхал Клеафас Агінскі.
38. Культавы будынак, прызначаны для збору хрысціян, здзяйснення богаслужэнняў і рэлігійных абрадаў. Напрыклад, у Мураванцы на Гродзеншчыне будынак узведзены ў XVI стагоддзі па абарончым тыпе.
40. Прадмет, прызначаны нагадваць аб чымсьці: аб месцы, наведванні краіны і г.д.
42. Прадмет звычайна невялікіх памераў. Яго прынята купляць падчас падарожжа і размяшчаць на халадзільніку.
45. Дакумент, які сведчыць права вынаходніка на яго вынаходства. Напрыклад, той, што выдадзены ў 1830 годзе пінскаму павятоваму маршалку дваранства Аляксандру Скірмунту на прыладу для выпарвання цукровых сіропаў.
46. Горад, дзе збіраюцца тэатралы пад сцягамі Міжнароднага фестывалю "Белая Вежа".

КУЛЬТУРА / KULTURA-INFO.BY
№ 40 / 1 КАСТРЫЧНІКА 2022 г.

На пірацкім вечары

Да дзяцей завітаў Бурацiна

Адзначыць юбілей добрымі традыцыямі

Не сакрэт, што бібліятэкі з'яўляюцца асаблівым месцам прыцягнення інтэлігентных, адукаваных і разумных людзей. Шмат такіх наведвае філіял №2 Цэнтральнай дзіцячай бібліятэкі Баранавічаў, якая сёлета адзначае 70-годдзе. Чым тут прываблiваюць чытачоў? Пра працоўныя будні і святы бібліятэкі пагаворым з яе загадчыкам Аленай Робак.

— У Баранавіцкай гарадской бібліятэчнай сістэме мы не адзіныя юбіляры: цэнтральны філіял летась адзначыў 80-годдзе, — распавядае Алена Мікалаеўна. — А сёлета на 7 жніўня прыпала наша 70-годдзе. Праўда, улетку мы яго не адзначалі, бо быў напружаны час летніх канікулаў. Мерапрыемствы, у якіх юныя чытачы змогуць павіншаваць бібліятэку, пачнуцца 18 лістапада. Мы ўжо прапанавалі ім стварыць тэматычныя малюнкі або вывучыць верш ці напісаць кароткае апавяданне, якія ва ўрачыстай абстаноўцы будуць прэзентаваныя "віноўнікам урачыстасці".

А павіншаваць ёсць каго. Усё жыццё прысвяціла рабоце ў бібліятэцы наш заслужаны ветэран **Ала Валюкевіч**. Доўга працуюць ва ўстанове **Ганна Сташынская** і **Святлана Пуцько**. **Святлана Шпак** адказвае за бібліятэчны сектар у гарадскіх мерапрыемствах, а **Джульета Аўсепян** узначальвае лялечны тэатр "Капрызка". З 1996 па 2018 гады існаваў створаны гэтымі маімі калегамі каардынацыйна-метадычны цэнтр "Палада" для дзіцячых і школьных бібліятэк горада.

— Колькі чалавек штогод наведвае бібліятэку? Якую літаратуру можаце прапанаваць?

— За год абслугоўваем больш за 8 тысяч чытачоў. Сёння ў нашым вялікім фондзе больш за 84 тысячы кніг. Рэгулярна абнаўляем яго паводле сучасных выдавецкіх і спажывецкіх тэндэнцый, аддаючы перавагу сацыяльна значнай літаратуры. У гэтым нам дапамагае картатэка адмоў. Калі падлеткі просяць кнігу, якой няма ў фондзе, мы ўносім яе назву ў картатэку, а потым закупляем. Шмат увагі надаем прыгожа выкананаму дызайну дзіцячай літаратуры, бо гэтак таксама можна прывабіць малечу да чытання.

Падпісваемся і на забаўляльна-пазнавальную перыёдыку для падлеткаў, расійскую і беларускую, больш за 70 найменняў. Гэты фондавы сегмент прыцягвае шмат чытачоў і дазваляе ўтрымаць іх у бібліятэцы.

— Якія клубныя праекты для падлеткаў у вашай установе?

— Сапраўды, сёння мы не толькі працуем у абанеменце. Бібліятэкару даводзіцца быць педагогам, псіхолагам, сацыёлагам, маркетолагам, акцёрам. За год нашы спецыялісты праводзяць каля 130 масавых мерапрыемстваў. Вялікай падмогай у гэтым з'яўляецца лялечны тэатр "Капрызка", які быў заснаваны ў 1998 годзе. Спектаклі заўсёды маюць вялікі поспех. Бібліятэкары самі шыюць пальчыкавыя лялькі, выкарыстоўваюць драматургічны матэрыял рознай накіраванасці: духоўнай, этычнай, патрыятычнай, эстэтычнай, экалагічнай. У аснове практычна любой п'есы ляжыць казка, народная ці аўтарская. Важнае месца ў рэпертуары лялечнага тэатра займаюць беларускія матывы. Такім чынам, у 2016 годзе работа па папулярызацыі айчыннай культуры стала асновай для крэатыў-праекта "Вясёлка юбілейных падзей". За яго мы атрымалі ганаровы дыплом першай ступені на XXV Рэспубліканскім конкурсе "Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры" ў намінацыі "За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем".

Асветніцкім брэндам бібліятэкі ў знаёмстве дзяцей з культурна-гістарычнай спадчынай з'яўляецца клуб "Хачу ўсё ведаць", створаны ў 1991 годзе. З самага пачатку тут ладзяцца мерапрыемствы па папулярызацыі гісторыі і культуры Беларусі, нашага Баранавіцкага раёна, па знаёмстве з найлепшымі творамі айчынных аўтараў. Экалагічнае выхаванне школьнікаў — задача клуба "Верабейчык". А ў клубе "Вырастай-ка" дзецям прывіваюць любоў да чытання, вучаць рабоце з разнастайнай інфармацыяй і літаратурай.

— Так, сёння праца бібліятэкара — гэта не толькі выдача кніг… А якімі мерапрыемствамі заахвочваеце дзяцей у юбілейным годзе?

— Традыцыйна цікавасць юных наведвальнікаў выклікаюць конкурсы летняга чытання "Лета і кніга", "Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі", "Библиосумерки". Тэатралізацыя гэтых падзей дапамагае ўтрымліваць увагу гарэзлівай аўдыторыі. Да такога свята бібліятэкары рыхтуюць буклеты з тэматычнымі пытаннямі, на якія трэба даць правільны адказ. Самых начытаных узнагароджваем. Сёлета буклет называўся "Юны кнігасышчык", якім мы заахвочвалі дзяцей да дэтэктыўных гісторый. Да фіналу дайшоў 31 дапытлівы чытач.

Арыгінальна ў нас праходзяць і "Библиосумерки". Дзякуючы прадуманай праграме, арганізацыі розных тэматычных зон, гэты форум носіць сямейную накіраванасць. Сёлета "Библиосумерки" правялі ў выглядзе пірацкага вечара "Свістаць усіх у бібліятэку!". Кожнае дзіця, якое да нас прыйшло, абрала сабе карсарскую мянушку. На карце, якая трапіла ў рукі юным піратам, быў пазначаны маршрут, па якім трэба рухацца ў пошуку прыгод. Падчас падарожжа ўдзельнікі пабывалі ў лакацыях "Марская зорка", "Пірацкі рай", "Востраў скарбаў". І дзеці, і дарослыя адгадвалі загадкі, адказвалі на пытанні віктарыны, прымалі ўдзел у спаборніцтвах і гульнях. Для творчых чытачоў на востраве "Ціхая гавань" быў арганізаваны майстар-клас, дзе кожны ахвочы мог вырабіць сабе пірацкую шаблю ў тэхніцы арыгамі. А куток аквагрыму яшчэ больш спрыяў стварэнню святочнага настроя.

Яшчэ бібліятэка больш за сем гадоў супрацоўнічае з баранавіцкай Дзіцячай студыяй дэкаратыўнага мастацтва Ірыны Літвінюк, і мы рэгулярна выстаўляем работы тамтэйшых навучэнцаў у нашых памяшканнях.

— Сёння бібліятэкары імкнуцца запрашаць на сустрэчу з дзецьмі пісьменнікаў. Як працуеце ў гэтым напрамку?

— Абавязкова запрашаем літаратараў, каб паказаць дзецям, як ствараюцца кнігі і прыдумляюцца гісторыі. Арганізоўваю гэтыя мерапрыемствы ў тым ліку і я. Напрыклад, адбылася сустрэча з пісьменнікам і выдаўцом Валерыем Квілорыя, лаўрэатам літаратурнага конкурсу "Русская прэмія" 2006 года (Масква), лаўрэатам і дыпламантам Міжнароднага конкурсу дзіцячай і юнацкай літаратуры імя Аляксея Талстога 2006 года і 2007 гадоў. Хлопчыкі і дзяўчынкі весела правялі час, задавалі пытанні, слухалі казкі. Зацікавіла падлеткаў і сустрэча з Надзеяй Ясмінска — аўтарам фантастычных аповесцей. Найбольш вядомая яна як аўтар кніг "Пацеркі і кроплі", "Кнігармонія", "Зефірныя прыкметы". Таксама нас наведвалі пісьменнікі Ірына Карнаухава, Святлана Гук, Мікола Бусько, Ігар Мацвееў.

Да саліднага юбілея мы падыходзім аптымістычна, з існымі традыцыямі і новымі праектамі. Што тычыцца мар пра падарункі, было б выдатна, каб у нас з'явіліся камп'ютары, з якімі змаглі б працаваць падлеткі. Але ж вялікі досвед працы з дзецьмі, атрыманы за сем дзясяткаў гадоў дзейнасці бібліятэкі, — гэта дасягненне ўсяго нашага калектыву і найлепшы скарб, які мы будзем захоўваць і надалей.

Павел САЛАЎЁЎ

На кніжных скрыжаваннях

У бібліятэкараў кожны месяц насычаны клопатамі, як завабіць да сябе чытачоў, як выгадаваць іх. І святочны верасень не становіцца выключэннем. Вашыя лісты, паважаныя, сведчаць, што ўсё атрымліваецца. І ў бібліятэкі ідуць і дарослыя, і дзеці. А як інакш, калі там столькі цікавага?!

Мастоўская раённая бібліятэка адкрылася пасля маштабнай мадэрнізацыі. Падчас святочнага адкрыцця бібліятэкары ўстановы ўзнагародзілі сваіх лепшых чытачоў, а будучым наведвальнікам — першакласнікам гімназіі № 1 Мастоў — уручылі першыя чытацкія білеты. Для дзяцей усіх узростаў дзейнічала гульнявая пляцоўка "МультыЛега", дзе можна было сустрэцца з віртуальнай рэальнасцю, паіграць на графічных планшэтах, прыняць удзел у майстар-класе па вырабе кветак з паветраных шароў і стварыць вясёлкавы настрой з дапамогай аквагрыму. Сапраўднае захапленне выклікалі навукова-забаўляльнае крыа-шоу і дыскатэка. Для аматараў больш спакойнага баўлення часу працавала адкрытая зона "Свет праз прызму навукі", дзе хлопчыкі і дзяўчынкі глядзелі на навакольны свет праз акуляр мікраскопа.

Супрацоўнікі **бібліятэкі-філіяла № 4 імя М.Лермантава г. Магілёва** арганізавалі ў асеннім скверы бібліяпікнік "КніГорад". Тут навучэнцы 1-3 класаў сярэдніх школ №№ 31 і 33 абласнога цэнтра даведаліся пра гісторыю бібліятэк і прынялі ўдзел у казачнай размінцы і розных конкурсах. Шасцікласнікаў жа запрасілі на літаратурнае мнагабор'е "Сусвет пад назвай КНІГА", каб пазмагацца за званне самага эрудзіраванага і начытанага. А інтэлектуалы-дзевяцікласнікі пабывалі ў ролі сапраўдных дэтэктываў падчас квеста "Чорныя vs Белыя". Яны раскрылі загадкавае забойства на фоне шахматнага антуражу. Для гэтага, праўда, падказкі прыйшлося шукаць па ўсёй бібліятэцы.

Цэнтральная гарадская бібліятэка Жодзіна прапанавала юным і дарослым чытачам "Невыпадковыя выпадковасці". На аднайменнай выставе можна было ўзяць кнігу, але не адну, а адразу тры, якія сустрэліся на своеасаблівым літаратурным перакрыжаванні і сталі непадзельнымі. Напрыклад, М.Елізараў "Бібліятэкар", М.Хейг "Паўночная бібліятэка" і А.Бадак "Ідэальны чытач", або А.Гаршкоў "Рэпарцёр", Г.Грас "Фотакамера" і М.Маляўка "Нябесны фатограф". "Матылькі кніжных старонак" таксама "зляцеліся" на выставу. І "Абсідыянавы матылёк"Лорэл Гамільтан суседнічаў з "Зорным матыльком" Бернара Вэбера і з "Матыльком з залатымі крыламі" сясцёр Ганны і Вольгі Валошыных. І гэта, канечне, далёка не ўсе прыклады. "Яркі свет фантазіі" панаваў у аддзеле дзіцячага чытання. Тут можна было ўбачыць працы дзяцей, выкананыя ў розных тэхніках: малюнкі на паперы алоўкамі, фламастэрамі, фарбамі, кропкавы жывапіс, арт-стоўн. Апошні ўражваў найбольш: творцы ішлі ад формы каменя, якая і падказвала дзіцяці пэўны малюнак.

КУЛЬТУРА / KULTURA-INFO.BY
№ 40 / 1 КАСТРЫЧНІКА 2022 г.

Бэзавыя сны і магія шчасця

Восень бязлітасна ўступіла ў свае правы, прымусіўшы людзей схавацца ў шэрыя паліто і страціць свае ўсмешкі. І шэрае неба, нібы адчуваючы настрой гараджан, насупілася, адмаўляецца прапускаць скупыя прамяні, каб сагрэць нас у гэтыя змрочныя дні. Аднак ёсць месцы, дзе ўсё яшчэ свеціць цёплае, амаль веснавое сонейка. І, што куды больш важна, свецяцца людзі!

Прынамсі, менавіта так было ў Брэсцкім абласным грамадска-культурным цэнтры, дзе ладзілася выстава мастачкі Вольгі Данілюк "Сиреневые сны". А ў кастрычніку змогуць выпраменьвацца тыя, хто пойдзе ў Брэсцкую бібліятэку імя Пушкіна: вырвацца з шэрай рэчаіснасці і трапіць у свет сноў і мараў наведвальнікам дапамогуць "бэзавыя карціны".

Нават праз фатаграфіі, якімі Вольга актыўна дзеліцца ў сацыяльных сетках, можна адчуць чароўнасць яе мастацтва. Як ёй удаецца так натуральна ўпускаць гледача ў свет сваіх твораў?

САМ-НАСАМ З ФАРБАЙ І ВАДОЙ

Магія ўнутры самой мастачкі, яна праяўляецца нават у тым, як Вольга працуе, з якім трапятаннем ставіцца да сваёй справы.

— Тэхніка акварэлі сама па сабе мяркуе чарадзейства. Мастак ніколі не ведае, што ў яго выйдзе. Якім бы майстар ні быў упэўненым і таленавітым, з наравістым матэрыялам даводзіцца дамаўляцца, дзесьці спадзявацца на волю выпадку, ісці за акварэллю, а не пярэчыць ёй. У моманты працы рэчаіснасць адыходзіць на другі план, усе жыццёвыя бязладзіцы забываюцца, ты застаешся сам-насам з фарбай і вадой, уваходзіш у стан, падобны ці то на транс, ці то на сон, атрымліваеш асалоду і не можаш адарвацца ад палатна, — натхнёна распавядае мастачка.

На карцінах Вольгі намаляваны Брэст. І гэта зусім не той горад, які бачаць турысты. Гэта горад кахання, горад рамантыкі, горад, у якім здзяйсняюцца мары. Маленькія ўтульныя панадворкі, кавярні, схаваныя ў лістоце, восеньскія лужыны і вясновы бэз — усё гэта крыніцы натхнення. Мастачка прызнае, што Брэст для яе асаблівае месца. Менавіта тут прайшлі самыя яркія гады яе жыцця — студэнцтва, першае вялікае каханне, нараджэнне сына... Цяпер Вольга жыве на два гарады. Яе майстэрня знаходзіцца ў Жабінцы, на малой радзіме, у Брэсце — яе сябры, культурнае жыццё, яе сэрца.

— Жабінка — мой куток для творчасці, а Брэст — для натхнення, — з усмешкай дадае Вольга. — Магчыма, мая настальгія па мінулым напаўняе карціны рамантыкай. Нашы ўспаміны накладаюць адбітак на ўсё, што мы робім у будучыні.

АДКУЛЬ ЖАДАННЕ МАЛЯВАЦЬ?

У адказ на пытанне аб тым, ці не складана сумяшчаць ролі мастачкі і мамы, Вольга смяецца. "Я ніколі не ставіла побач са сваім дзіцем слова «цяжка». Сын заўсёды са мной, у нас поўная гармонія ў адносінах". Не дзіўна, што чалавек з яркай і моцнай душой бачыць асобу нават у немаўляці. Мастачка распавяла пра тое, як важна выбудоўваць з дзіцем паважлівыя адносіны, і тут жа становіцца зразумела, адкуль наогул паўстала жаданне маляваць.

— Мяне часта пыталіся, ці не мастак мой тата, настолькі ён творчы чалавек, — смеючыся прызнаецца Вольга. І сама ж адказвае на сваё пытанне: — Не, не мастак, ён інжынер-будаўнік, але пры гэтым усё жыццё рабіў нешта рукамі: выразаў па дрэве, займаўся чаканкай. У яго прыроджанае пачуццё густу. Нягледзячы на тое, што мы былі звычайнай савецкай сям'ёй, наш дом заўсёды вылучаўся: татава рука ператварала шараговыя рэчы ў асаблівыя.

ЖЫЦЦЁВЫЯ РАЗДАРОЖЖЫ

Адчуваючы вакол сябе прыгажосць і мастацтва, Вольга абрала будучую прафесію і паступіла ў БрДУ імя Пушкіна на мастака-педагога. Больш за дзесяць гадоў яна займалася роспісам тканіны — батыкам, аднак на акварэль перайшла вымушана: падвяло здароўе. У дзяўчыны пачалася алергія на выпарэнні, якія выклікалі фарбавальнікі. У момант гэтага жыццёвага раздарожжа — працягваць ахвяраваць здароўем або шукаць нешта новае — Вольга знайшла каробку з акварэллю са студэнцкіх гадоў у некранутым стане. У юнацтве яна не вельмі любіла празрыстыя фарбы, але, паспрабаваўшы зноўку, зразумела: гэта тое, што зараз патрэбна. Акварэль, як і батык, патрабуе выразнай тэхнікі. Выбіраючы складаныя для выкарыстання матэрыялы, Вольга паказвае сябе як моцную, упэўненую асобу.

Нягледзячы на рамантычнасць і пяшчоту, якія пераважаюць у працах Данілюк, ёсць у яе палотнах сіла, унутраны стрыжань. Асабліва вылучаюцца карціны "Пункт гледжання" і "Чаканне", яны ўсё яшчэ поўныя магіі, але пры гэтым нейкай іншай, зусім не кранальнай, але магутнай і моцнай, аўтарытэтнай.

"Калі я жанчына, гэта не значыць, што я толькі легкадумны матылёк або страказа", — мастачка не тое каб супрацьстаіць гендарным стэрэатыпам: яна сваёй творчасцю, сваёй асобай дае зразумець, наколькі яны бессэнсоўныя. Вольга цвёрда перакананая, што сутнасць чалавека ў яго шматграннасці. Спалучаючы ў сабе мяккасць і сілу, яркасць і незаўважнасць, здольнасць пагрузіцца ўнутр сябе ці ператварыцца ў маўклівага назіральніка, Вольга застаецца шчырай і са сваімі прыхільнікамі, і з сабой.

СОНЦА АБАВЯЗКОВА!

Сапраўды зачароўвае тое, як Вольга раскрывае розныя грані сваёй асобы. Вось на выставе яна кранальная і пяшчотная, і, гледзячы на карціны, у якіх так шмат сонца, чараўніцтва і мары, немагчыма падзяліць гэтыя вобразы і тую, хто іх стварыў. Прытым у мастачкі ёсць і іншае захапленне — яна ўласнымі рукамі вырабляе ўпрыгожванні з дрэва. Брошкі, завушніцы, кулоны — і ўсе яркія, маляўнічыя, жыццярадасныя. Сярод вырабаў і жывёлы, і рэпрадукцыі вядомых карцін, і рэчы, якія адлюстроўваюць хобі заказчыка, — гітара, кубак кавы або маленькая вытанчаная балерына. На сваіх старонках у сацыяльных сетках Вольга не проста выстаўляе вырабы, не, яна даносіць да людзей сваю філасофію: "Мае ўпрыгажэнні пра тое, каб ствараць свята", "Я ўпрыгожваю вас, каб вы ўпрыгожвалі свет", "За кожным дажджом абавязкова прыйдзе сонца і вясёлка".

Вольга верыць у тое, што мастацтва павінна выхоўваць у чалавеку лепшае, і сама яна нясе ў свет святло і дабро. Для яе важна, каб яе карціны выклікалі эмоцыі, прымушалі задумацца, асэнсаваць сваё жыццё.

— Не заўсёды людзі могуць зразумець, аб чым я пішу. Хоць часам бывае, падыдуць на выставе, скажуць, што адчулі пры поглядзе на абстракцыю, а ў мяне мурашкі па скуры: гэта ж мае эмоцыі, мае перажыванні. А бывае, што бачаць у карцінах нешта сваё, патаемнае і трапяткое. І гэта таксама выдатна.

ДАСТУКАЦЦА ДА ЛЮБОГА СЭРЦА

Вольга Данілюк — яскравая прадстаўніца сучаснага мастацтва, чые карціны знаходзяцца ў прыватных калекцыях Беларусі, Расіі і дальняга замежжа. «Сиреневые сны» — яе трынаццатая персанальная выстава. Вольга актыўна вядзе сацыяльныя сеткі, за ёй сочаць не толькі жыхары Брэста (для іх яна фея, што прымушае азірнуцца і ўбачыць прыгожае ў штодзённым), на яе выставы прыязджаюць з розных куткоў краіны і нават свету, таму што мастацтва не ведае межаў. Мастацтва здольнае дастукацца да любога сэрца. Асабліва мастацтва, створанае са шчасця і для шчасця.

Ксенія ЗАРЭЦКАЯ
Фота з выставы "Бэзавыя сны"

Натхнёныя класікай

Юбілей Янкі Купалы шырока адзначае не толькі музей класіка. Творчыя акцыі да 140-годдзя з дня нараджэння першага Народнага паэта Беларусі працягваюцца ў розных установах краіны.

Рэспубліканская выстава-конкурс **"Пад небам сінім"** да 140-годдзя Янкі Купалы і Якуба Коласа працуе ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі. У экспазіцыі дэманструюцца работы навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй і дадатковай адукацыі. Гэта ілюстрацыі, кніжныя вокладкі, буктрэйлеры, анімацыя і дэкаратыўна-прыкладныя творы, прысвечаныя тэмам роднага краю і кахання, беларускім абрадам і казкам, літаратурным героям Янкі Купалы і Якуба Коласа. Самымі папулярнымі аказаліся вобразы Сымона-музыкі, Паўлінкі, Гусляра, Дудара, Бандароўны, Рака-вусача, Жняі, Маці, Савосяраспутніка. Кожная работа суправаджаецца радкамі з вершаў беларускіх класікаў, што сведчыць аб цікавасці дзяцей да іх творчасці.

Рукапісы вершаў Янкі Купалы, якія ўвайшлі ў зборнік "Спадчына"

Дом-музей I з'езда РСДРП запрашае на выставу **"Янка Купала. Кватэра №1"**. Вядома, што паэт з 1921 па 1923 год пражываў у гэтым будынку. Там зрабіў першы пераклад "Слова аб палку Ігаравым" на беларускую мову і напісаў шэраг паэтычных твораў. Наведвальнікі пабачаць фотаздымкі класіка і яго сваякоў, асабістыя рэчы і дакументальныя матэрыялы. Да прыкладу, дэманструецца пасведчанне Янкі Купалы на прадмет ільготнага карыстання электрычным асвятленнем.

Нацыянальны мастацкі музей на афіцыйным сайце апублікаваў віртуальную выставу **"Ён — Купала"**. Трыбун нацыянальнага адраджэння стаў адной з самых прывабных асоб для мастакоў. Яго постаць, біяграфія, творчая спадчына натхнілі мноства аўтараў на жывапісныя палотны. Асаблівую каштоўнасць сярод іх уяўляюць работы майстроў, якія асабіста ведалі паэта. Сярод такіх анлайн-экспанатаў — карціна Сцяпана Андруховіча, частага госця Купалавага дома. Маладога творцу ў росквіце сіл паказваюць на сваіх палотнах Гаўрыіл Вашчанка і Міхаіл Савіцкі. Знакавую старонку з гісторыі нацыянальнага тэатра — прэм'еру камедыі "Паўлінка" ў 1913 годзе — узнаўляе Уладзімір Тоўсцік на карціне "9 лютага. Пецярбургская прэм'ера". Таксама інтэрнэт-карыстальнікам даступныя фотарэпрадукцыі твораў Абрама Кроля, Леаніда Дударэнкі, Хаіма Ліўшыца, Уладзіміра Стэльмашонка і іншых вядомых мастакоў. Віртуальную галерэю суправаджае змястоўны каментарый вядучага навуковага супрацоўніка музея Настассі Трафімчык.

КУЛЬТУРА / KULTURA-INFO.BY
№ 40 / 1 КАСТРЫЧНІКА 2022 г.

Дэпутацкія клопаты Якуба Коласа

Якуб Колас, Масква, 1956 г.

Для большасці з нас Якуб Колас — вядомы паэт і пісьменнік, таленавіты вучоны і выдатны педагог. На жаль, даследаванню яго грамадскай дзейнасці дагэтуль не надавалася належнай увагі. Хаця на гэтай ніве народны паэт зрабіў нямала!

З 1940 года Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч — дэпутат Вярхоўнага Савета БССР. Пасля далучэння Заходняй Беларусі да БССР прайшлі выбары ў вышэйшы орган дзяржаўнай улады ад заходніх абласцей. 24 сакавіка 1940 года газета "Звязда" паведаміла, што народны паэт Беларусі Якуб Колас быў абраны дэпутатам ад Свержанскай выбарчай акругі — выбарчыкі малой радзімы песняра аказалі яму высокі давер. Якуб Колас адразу ўключаецца ў працу — з 25 па 27 красавіка прымае ўдзел у рабоце Чацвёртай сесіі Вярхоўнага Савета БССР першага склікання.

СЛУЖЫЦЬ НАРОДУ — ВЯЛІКАЕ ШЧАСЦЕ

Як паэт і пісьменнік Якуб Колас заўсёды адклікаўся на праблемы простага чалавека, у вершах, паэмах, аповесцях і апавяданнях, публіцыстыцы паказваў жыццё ва ўсёй яго складанасці і супярэчнасці. Стаўшы дэпутатам, творца дзейсна вырашае многія пытанні, якія не давалі супакою яго чуламу сэрцу. **"Служыць народу — вялікае шчасце, у гэтым сэнс маёй дэпутацкай і паэтычнай дзейнасці"**, — пісаў Якуб Колас. Паэт быў дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР чатырох скліканняў, абіраўся намеснікам Старшыні Вярхоўнага Савета (у 1947 і 1951 гг.), членам Прэзідыума (1955 г.).

З 1938 па 1948 гады Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР быў Нічыпар Якаўлевіч Наталевіч. Менавіта ён віншаваў паэта з 60-годдзем з дня нараджэння ад урада БССР у 1942-м у Ташкенце, дзе Якуб Колас знаходзіўся ва эвакуацыі падчас Вялікай Айчыннай вайны. Паэту падаравалі срэбраны партсігар з гравіроўкай: **"Народнаму паэту Якубу Коласу ў дзень 60-годдзя ад ураду БССР. 3/XI-42 г."**

У цяжкі час вайны Якуб Колас дапамагаў эвакуіраванаму насельніцтву Беларусі па праблемах уладкавання на працу, атрымання неабходных даведак і дакументаў, забеспячэння жылём, устанаўлення пенсіі сем'ям загінулых на фронце і па многіх іншых пытаннях.

12 жніўня 1943 года Якуб Колас як дэпутат Вярхоўнага Савета БССР звяртаецца да другога сакратара ЦК КП (б) Узбекістана М. А. Ламакіна з хадайніцтвам аказаць матэрыяльную дапамогу эвакуіраванай з Ленінграда праўнучцы А. С. Пушкіна Веры Каэтанаўне Красоўскай і яе сыну, талентавітаму мастаку-графіку, дэмабілізаванаму на хваробе з арміі. **"В Ташкенте они испытывают острую нужду в условиях своего быта. Кроме 800 граммов хлеба ... они не получают никакого снабжения... От голодания он** *(прапраўнук. — аўт.)* **теряет зрение, не имеет ни обуви, ни одежды"**, — пісаў Якуб Колас.

Падчас вайны Якуб Колас падтрымліваў многіх — дапамагаў Ганне Ахматавай, на пару дзён прытуліў у сваім пакоі сям'ю беларускага крытыка і тэатразнаўца Міхаіла Модэля, спрыяў паляпшэнню жыллёвых умоў супрацоўнікаў Акадэміі навук БССР, апекаваўся бежанцамі. Гэта пералік толькі невялікай часткі праблем, вырашэннем якіх займаўся беларускі паэт.

НЕЗАБЫЎНЫЯ СУСТРЭЧЫ

У студзені 1946 года Якуб Колас быў вылучаны кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР і ў справаджэнні Пятра Глебкі накіраваўся ў перадвыбарную паездку па Навагрудчыне. Якуб Колас пісаў: **"Нядаўна мне выпала шчасце спаткацца са сваімі землякамі, наведаць тыя краі, дзе працякло маё маленства. Мы ехалі ў Навагрудак — горад, які вылучыў мяне сваім дэпутатам у Вярхоўны Савет Саюза ССР... Стоўбцы, Свіцязь, Любічы, Карэлічы, Гарадзішча, Нягневічы, Запольск, — колькі сустрэч з сялянамі, рабочымі, настаўнікамі, звычайнымі савецкімі людзьмі, сустрэч, якіх да канца маіх дзён мне не забыцца..."**

Усюды, дзе выступаў паэт, яго сустракалі шчыра, гасцінна, прыязна. У сваёй прамове перад выбаршчыкамі Якуб Колас сказаў: **"Дарагія таварышы! Я прыехаў да вас, каб прынесці вам самую шчырую, самую глыбокую падзяку за тое, што вы вылучылі мяне кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР. Я добра ведаю і памятаю, што такое дэпутат народа і якія яго абавязкі. Я абяцаю быць вашым верным слугою, дапамагаць ва ўсім, апраўдаць ваша давер'е".**

Незабыўнымі сустрэчы былі не толькі для Якуба Коласа, але і для яго выбаршчыкаў. Так Уладзімір Урбановіч, былы настаўнік Валеўскай сярэдняй школы, успамінаў: "Многія помняць гэтыя сустрэчы. Помню іх і я. Звычайна народны паэт, падняўшыся на трыбуну, адкладваў убок акуляры. Адсоўваў лісткі напісанай прамовы і пачынаў проста і шчыра гутарыць з народам. У яго прамове не было адточаных, трасакатлівых выразаў, прамоўніцкіх жэстаў. Ён проста гутарыў, раіўся са сваімі выбаршчыкамі так, як гэта робяць у дружнай і шчырай сям'і. Пасля афіцыйнага сходу кандыдат у дэпутаты звычайна яшчэ доўга заставаўся ў зале, гутарыў з тым, хто да яго звяртаўся. Я бачыў усё — гэта быў не проста давер, а выяўленне народнай любові да свайго духоўнага настаўніка".

СПАЛУЧАНА З НАВАГРУДСКАЙ ЗЯМЛЁЙ

12 лютага 1946 года газета "Звязда" паведаміла аб абранні Якуба Коласа дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР ад Навагрудскай выбарчай акругі Баранавіцкай вобласці БССР. **"Мне дорагі звычайныя простыя савецкія людзі, людзі вялікай душы і чыстага сумлення; дорагі цёхія лясныя азёры і праторныя калгасныя палі, сасновыя пушчы і павольнае цячэнне рэк. Я люблю сваю савецкую Беларусь адданай сыноўняй любоўю. Дзякуючы ёй я стаў паэтам. Родная Савецкая Беларусь дала мне найвышэйшую чэсць, выбраўшы дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР", —** адзначаў Якуб Колас.

Жыццё класіка беларускай літаратуры Якуба Коласа доўгі час было спалучана з навагрудскай зямлёй, у 1950 і 1954 гадах паэта паўторна выбіраюць дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР. Якуб Колас не раз наведвае гэты рэгіён для сустрэч з выбаршчыкамі і вырашэння шэрагу пытанняў.

Да Якуба Коласа як да дэпутата Вярхоўнага Савета БССР і СССР прыходзіла вялікая колькасць лістоў з просьбамі аб дапамозе. Ён вельмі ўважліва чытаў звароты і адказваў адрасатам, аб чым сведчаць надпісы, зробленыя рукой пісьменніка на канвертах, рабіў захады каб дапамагчы людзям, якія трапілі ў складаныя жыццёвыя абставіны. Матэрыяльная падтрымка, вырашэнне жыллёвых пытанняў, садзейнічанне пры ўладкаванні на працу, дапамога цяжка хворым атрымаць неабходнае лячэнне — пералік невялікай часткі праблем, вырашэнню якіх садзейнічаў паэт.

Дэпутацкі білет БССР

Дэпутацкі білет СССР

КУЛЬТУРА / KULTURA-INFO.BY
№ 40 / 1 КАСТРЫЧНІКА 2022 г.

З выхаванцамі Брэсцкага дзіцячага дома імя Якуба Коласа, красавік 1955 года

"АДДАДЗІЦЕ ГРОШЫ, КАЛІ БЕДНЫМ БУДУ Я"

Ідучы насустрач людской патрэбе, Канстанцін Міхайлавіч не любіў марных трат, неразважлівага выдаткавання сродкаў і, на першы погляд, мог здацца скупаватым. Але паэт сам зведаў цяжкасці жыцця, голад і галечу, ведаў чаго варта праца і заробленыя грошы. Менавіта працу простага чалавека шанаваў Якуб Колас, і толькі гэта пабуджала яго да ашчаднасці. Бо іначай не аддаваў бы ён на пазыкі амаль палавіну ганарару за свае творы, не адсылаў бы просьбітам значную частку акадэмічнай зарплаты кожны месяц. Якуб Колас адчуваў унутраны абавязак падтрымаць, а часамі і выратаваць чалавека.

Вельмі часта ў сяброўскіх размовах паэту перад пасылкай грошай раілі справіцца аб адрасасе і яго рэальных умовах жыцця, хоць бы спытацца ў райвыканкаме ці сельсавеце:

"Буду я яшчэ задаваць людзям работы, — звычайна адказваў Канстанцін Міхайлавіч. **— Каб у раёне маглі дапамагчы, дык дапамаглі б. Пасля такой вайны гора і нястач у людзей не абярэшся. І людзям трэба верыць. Думаеце, хлопцы, лёгка адкрыць рот, каб папрасіць што-небудзь? Ой, цяжка! Ну, няхай я раз памылюся, затое дзесяць разоў падам руку тым, каму яна трэба".**

І сапраўды, паэт амаль беспамылкова выбіраў з свае ергомністае поштты лісты, якія патрабавалі грамадскай, дзяржаўнай ці асабістай дапамогі. Гэта не раз пацвярджалася. У адказ прыходзілі вельмі цёплыя лісты са словамі ўдзячнасці, запрашэнні на наваселле ў адбудаваную хату, на свежы творг ад купленай з яго дапамогай каровы ці на сельскае свята, дзе будуць танцаваць пад нядаўна набыты паэтам гармонік. А калі просьбіты часам прыходзілі да пісьменніка, каб вярнуць пазыку, Якуб Колас ніколі не браў грошай. **"Аддадзіце грошы, калі бедным буду я",** — звычайна гаварыў пясняр.

У асабістым архіве паэта захаваліся сотні квіткоў грашовых пераводаў, якія Якуб Колас дасылаў людзям з розных куткоў Беларусі. Канешне, дапамагчы ўсім, хто звяртаўся да паэта па матэрыяльную дапамогу, было немагчыма. Колас гэта разумеў. У кнізе Максіма Лужаніна "Колас расказвае пра сябе" ёсць наступныя ўспаміны: **"Гэтаму — трэба хату перакрыць,** — Канстанцін Міхайлавіч пералажыў верхні перавод уніз, — **а вось,** — ён паказаў пальцам на наступны перавод, — **жанчына пісала, што на карову не хапае. Тут — дзецям крыху пасылаю, засталіся без бацькі на вайне, а нядаўна і маці памерла. І яшчэ ёсць просьбы, ды ўсіх не адзеліш. Можа і пакрыўдзіцца хто, скажа: глухі стаў Якуб Колас. Але мне здаецца, што на сапраўды пільныя патрэбы я адгукаюся".**

...НЕ МОГ ПРАЙСЦІ МІМА ДЗІЦЯЧАЙ БЯДЫ

Будучы шчырым і чулым чалавекам, Якуб Колас не мог прайсці міма чужой бяды, асабліва калі ў цяжкім становішчы знаходзіліся дзеці, бацькі якіх загінулі падчас вайны. Дзіцячыя дамы былі ў дрэнным стане, выхаванцам была патрэбна падтрымка і дапамога. Канстанцін Міхайлавіч апекаваўся Мінскім, Чавускім, Брэсцкім, Мікашэвіцкім, Касцюковіцкім дзіцячымі дамамі. Напрыклад, вёў перапіску з выхаванцамі Брэсцкага дзіцячага дома № 2. Па просьбе дзяцей і са згоды Якуба Коласа ў студзені 1955 года гэтай установе было прысвоена імя пісьменніка. Пясняр падараваў дзіцячаму дому бібліятэку кніг з дарчымі надпісамі і запрасіў групу выхаванцаў да сябе ў Мінск. Тры дні дзеці гасцявалі ў пісьменніка, наведалі балет, сустрэліся з вядомым дзіцячым пісьменнікам Янкам Маўрам, і, канешне ж, сфатаграфаваліся на памяць.

22 сакавіка 1947 года Якуб Колас як дэпутат Вярхоўнага Савета СССР і БССР звяртаецца да Старшыні Савета Міністраў БССР П.К. Панамарэнкі з лістом, у якім гаворыць пра складаныя матэрыяльныя жыллёва-бытавыя ўмовы, у якіх знаходзяцца дзеці-сіроты Мікашэвіцкага дзіцячага дома. Бацькі дзяцей загінулі на франтах Айчыннай вайны. **"Прашу Вас даць адпаведным установам указанне аб вылучэнні грузавой аўтамашыны для патрэб дзіцячага дома і аб водпуску 30 кубаметраў піламатэрыялаў на рамонт памяшкання. Гэта дапаможа карэнным чынам палепшыць умовы жыцця і выхавання дзяцей",** — пісаў Канстанцін Міхайлавіч. Намаганні паэта давалі плён — праблемы, з якімі ён звяртаўся, вырашаліся.

"ВЫ, ШКОЛЬНІКІ, — НАША БУДУЧЫНЯ"

Якуб Колас як настаўнік разумеў патрэбу ў атрыманні адукацыі, таму будучы дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР апекаваўся будаўніцтвам школ, напрыклад у вёсках Мікалаеўшчына, Мікулічы, Сінкевічы і іншых населеных пунктах па ўсёй Беларусі.

У 1947 годзе паэт наведаў вёску Сінкевічы. "Мне выпаў вялікі гонар вітаць Якуба Коласа, — расказвала сямікласніца Ірына Салтыкова. — Памятаю, што моцна хвалявалася, блыталіся словы. Гаварыла па-беларуску. Якуб Колас уважліва слухаў і пасля майго выступлення сказаў: «**Мне радасна глядзець на падрастаючае пакаленне. Вы, школьнікі, — наша будучыня. Любіце Радзіму, жывіце дзеля яе, услаўляйце родную старонку старанней вучобай цяпер, а пасля — не менш старанней працай...**»

Да 140-годдзя з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры, народнага паэта Беларусі Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа падрыхтаваў часовую экспазіцыю з фондаў "Якуб Колас — дэпутат", якая была прадстаўлена на адкрыцці дзявятай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Партсігар ад урада

Сустрэча з навучэнцамі адбылася ў цеснай старой сямігодцы. Якуб Колас звярнуў увагу, у якіх складаных умовах займаліся дзеці, абяцаў дапамагчы пабудаваць новую школу-дзесяцігодку. Сваё абяцанне паэт выканаў. У 1949 годзе дзеці з Сінкевіч, Мокрава, Намакрава, Обруба і іншых навакольных вёсак святкавалі наваселле ў прасторным двухпавярховым драўляным памяшканні небывалых для таго часу памераў.

"...КАБ СЛОВЫ НЕ ЎПАЛІ НА БЯСПЛОДНЫ КАМЕННЫ ГРУНТ"

Якуба Коласа хвалявала пытанне аб ачыстцы палёў ад камення. Абапіраючыся на матэрыялы інстытута геалогіі Акадэміі навук, паэт прыводзіў жахлівыя лічбы кубаметраў валуноў, камення, якія засмечвалі зямлю ў шэрагу раёнаў, што негатыўна ўплывала на земляробства. А для будаўнічых патрэб каменне завозяць з-за мяжы. Канстанцін Міхайлавіч лічыў патрэбным з сабранага камення стварыць фонд будаўнічых матэрыялаў для патрэб горада і сяла, што дасць магчымасць, напрыклад, пабудаваць памяшканні для жывёлы ці забруковаць вуліцы вёсак. **"Дазвольце мне пакінуць гэту трыбуну ў добрай надзеі, што мае словы аб каменнях не ўпалі на бясплодны каменны грунт",** — звяртаўся Якуб Колас да выбаршчыкаў.

"НЕПАВАГА ДА СВАІХ ПРОДКАЎ НЕ ЁСЦЬ СВЕДЧАННЕ АБ НАШАЙ КУЛЬТУРЫ"

Яшчэ адным клопатам народнага паэта было добраўпарадкаванне могілак. 17 мая 1956 года Пятру Андрэевічу Абрасімаву Якуб Колас напісаў: **"Як мне вядома, амаль усюды па Беларускай Савецкай Рэспубліцы ў страшэннай запушчанасці знаходзяцца могілкі, дзе спачываюць вечным сном людзі, сышоўшыя ў магілы. Могілкі не агароджаны, па іх бесперашкодна топчацца скаціна. А на гэтых могілках ёсць вядомыя людзі, што прысвяцілі сваю дзейнасць, сваё жыццё народу і Радзіме — Францішак Багушэвіч, Дунін-Марцінкевіч і шмат іншых. Такая непавага да сваіх продкаў не ёсць сведчанне аб нашай культуры. Я прашу Вас падняць гэта пытанне для прыняцця адпаведных мер па ўпарадкаванню сельскіх і гарадскіх могілак".** Дзякуючы намаганням паэта былі агароджаны і добраўпарадкаваны Вайсковыя могілкі горада Мінска, могілкі Церабяжы ў Мікалаеўшчыне і шмат іншых па ўсёй тэрыторыі Беларусі

Якуба Коласа хвалявалі многія праблемы, якія ён не мог пакінуць без сваёй увагі. Ачуваўленне гарадоў, разбураных падчас вайны, асвятленне вуліц і рамонт дарог у населеных пунктах і вёсках, ашчаднае выкарыстоўванне вады і электрычнасці, вырашэнне жыллёвых пытанняў, садзейнічанне вяртанню на Беларусь лепшых кадраў, беларускіх вучоных і інтэлігенцыі, для развіцця навукі і культуры краіны — пералік невялікай часткі тых пытанняў, якімі займаўся паэт як дэпутат Вярхоўнага Савета БССР і СССР. Дэпутацкія клопаты адымалі шмат часу і сіл пісьменніка, але народны паэт, чулы да людской бяды, адчуваў унутраны абавязак дапамагаць.

Васіліна МІЦКЕВІЧ,
Вольга НАВАЖЫЛАВА
Фота з фондаў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 397 01 63
(экскурсійнае бюро)

• **Пастаянныя экспазіцыі.**
• Юбілейная выстава **"Чароўны Мінск"**, прысвечаная 125-годдзю з дня нараджэння выдатнага беларускага графіка, майстра лінагравюры Анатоля Мікалаевіча Тычыны. **Да 17 кастрычніка.**
• Выстава **"Невядома аб вядомым. Пра што кажуць кветкі"**. У экспазіцыі будуць прадстаўлены творы з фондаў музея, а таксама з карпаратыўнай калекцыі ААТ "Белгазпрамбанк". **Да 13 лістапада.**
• Выстава да 135-годдзя з дня нараджэння Марка Шагала. **Да 4 лістапада**.

Выставачны корпус, вул. К. Маркса, 24
• Выставачны праект **"Жаночы Род". Да 1 кастрычніка.**

УНП 100377771

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І ПАЛОВЫ XIX СТ."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а.
Тэл.: +375 17 363 77 96, +375 17 358 88 78

• **Пастаянная экспазіцыя**.
• Выстава твораў мастакоў XIX – пачатку XX ст. **"Свет дзяцінства"** з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. **Да 1 лістапада.**

УНП 100377771

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён.
Тэл.: +375 17 507 44 68

• **Пастаянная экспазіцыя**.
• Выстава **"Адзінства ў разнастайнасці"** — творчы праект мастакоўскай сям'і Курачыцкіх. Станковы жывапіс, пластыка з шамоту і керамікі, мармурнай крошкі і бронзы. **Да 20 кастрычніка.**

УНП 100377771

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37.
Тэл. 8 (0222) 65 02 03, 65 88 00

• **Пастаянныя экспазіцыі**.
• Выстава **"Мора. Неба. Аблокі"**, прысвечаная адлюстраванню ў беларускім мастацтве XX стагоддзя прыродных з'яў і разнастайных форм адпачынку чалавека на прыродзе ў розныя поры года. **Да 2 кастрычніка.**
• Праграма **Art-lectorium "Зразумелае мастацтва". Праводзіцца заўсёды.** Падрабязней на сайце музея (artmuseum.by) альбо па тэлефонах: 8 (0222) 65 02 03, 65 88 00.

УНП 100377771

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Некрасава, 3. Тэл.: 399-09-78

• Выстава мастакоў з Беларусі і Расіі **"Песняры зямлі беларускай". Да 23 кастрычніка.**
• Праект мастака **Сяргея Лескеця "Шэпт". Да 23 кастрычніка.**
• Персанальная выстава **Валянціна Нуднова "Цела Вады". Да 23 кастрычніка.**
• Віртуальны праект **"Адзіная спадчына".** Даступны на сайце ncsm.by. **Да 31 снежня.**
• Выстава **"HOMESAPIENS. ЗАМЕДЛЕНИЕ. GREENHOUSE". Да 23 кастрычніка.**
• Майстар-класы для школьнікаў: **"Акварэльныя замалёўкі", "Начны пейзаж", "Што пабачылі мае вочы...", "Колер. Форма. Кампазіцыя", "Аб'ёмнае мадэляванне".** Для груп ад 5 чалавек па папярэднім запісе.

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 47. Тэл.: 272-78-14

• Выстава твораў беларускіх мастакоў **"Кропкі судотыку". Да 16 кастрычніка.**
• Выстава беларускіх народных рамёстваў **"Праз стагоддзі ў будучыню".**

УНП 192543414

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8-01596) 3 62 90, (8-01596) 3 62 70

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Выстава кішэнных гадзіннікаў **"Гадзіны ідуць, і дні, і гады..."** 3-ці паверх Паўночнага корпуса. **Да 31 кастрычніка.**
• **Выстава "Белая зброя краін свету".** 1-шы адсек Паўночнага корпуса. **Да 25 снежня.**
• Аглядныя і тэматычныя экскурсіі.
• Экскурсіі з элементамі тэатралізацыі для дзяцей і дарослых.
• Экскурсія для дваіх **"Інтрыгі Купідона".**
• Сямейная квэст-экскурсія **"Легенды і паданні Мірскага замка".**
• Музейныя заняткі для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту: **"Святочная страва для князя па старадаўнім рэцэпце"; "Асаблівасці жаночага касцюма XVIII ст."; "Арганізацыя войска і вайсковая справа ВКЛ у XVI ст."; "Печы з каробкавай кафлі XVI—XVII стст. у палацы князёў Радзівілаў".**
• **Квэст «Таямніца двух куфраў».** Арганізатары прапаноўваюць удзельнікам прайсці выпрабаванні і разгадаць таямніцу князёў Радзівілаў. Квэст разлічаны на адначасовы ўдзел ад 10 да 50 чалавек і прадугледжвае ўдзел асобных каманд з колькасцю ўдзельнікаў у кожнай ад 1 да 5. **8 кастрычніка.**

УНП 590201541

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, д. 2.
Тэл.: +375 212 66-90-77 (каса)

• Казка-гульня на 2 дзеі. **"Бука". 1 кастрычніка ў 11.00.**
• Казка на 1 дзею. **"Касмічная казка". 2 кастрычніка ў 11.00.**

УНП 300001869

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: +375177020602, 20660, +375295518051, +375291903149

Палацавы ансамбль:
• Міжнародны выставачны праект **"Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара"**. У складзе пастаяннай экспазіцыі.
• Часовая экспазіцыя **"GLORIA ARME: ваенна-гістарычная рэканструкцыя даспехаў і зброі".** Вялікая выставачная зала. **Да 23 кастрычніка.**
• Выставачны праект, прысвечаны Году гістарычнай памяці, **"Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны". Да 15 студзеня 2023 г.** У экспазіцыйнай зале першага пускавога комплексу.
• Выстава-атракцыён па матывах творчасці мастака і рэжысёра Алы Мацюшэўскай **"Час — хуткая рака"** — да Года гістарычнай памяці. Гульня-блукалка **"Вандроўка ў свет анімацыі"** (па матывах выставы-атракцыёна). **Да 9 кастрычніка.**

Мерапрыемствы:
• Квэсты: **"Палацавыя таямніцы"; "Музычная скарбніца Нясвіжскага палаца".**
• Віртуальныя выставы: **"Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны", "Нясвіж – здабытак сусветнай культуры",** выстава Паўла Татарнікава **"Магнацкія двары і замкі Беларусі".**
• **Тэматычныя і аглядныя экскурсіі па гісторыка-архітэктурных помніках і ландшафтных парках г. Нясвіжа.**

Ратуша (г. Нясвіж, вул. Савецкая, 3):
Пастаянныя экспазіцыі:
• **"Гарадское самакіраванне ў Нясвіжы ў XVIII — 1-й палове XIX стст."**
• **"Нясвіж у міжваенны час. Людзі падзеі".**
• Калекцыя гадзіннікаў XIX—XX стст. **"Культура часу"**. З фондаў музея-запаведніка.

Мерапрыемствы:
• Квэсты: **"Карта сямі каралеўстваў"; "Музейны дэтэктыў", "Музейнае расследванне".**
• Культурныя мерапрыемствы: **"Прыём у княгіні", "Дзень нараджэння ў Ратушы"** (група да 12 чалавек ад 6 да 11 гадоў), **"Дзень нараджэння з лялькай Лол", "Дзень нараджэння з клаўнэсай Карамелькай"** (група ад 4 да 10 чалавек ад 4 да 12 гадоў).
• Сюжэтна-ролевая развівальная праграма **"Школа шпіёнаў".** Да 25 чалавек.
• Гульня-знаёмства **"Музейка аб музеі"** (група да 25 чалавек ад 4 да 7 гадоў).
• Гульнёвая праграма **"Выкрунтасы"** (група да 25 чалавек).

Падрабязнасці па тэлефонах: +3751770 20602, +3751770 20660 або на сайце niasvizh.by.

УНП 600207920

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай Камуны, 1.
Тэл.: +375 (17) 243 10 41 (каса), +375 (17) 361 54 93

• Опера ў 2-х дзеях. Прэм'ера. **"Любоўны напой". 1 кастрычніка ў 18:00.**
• Опера. Прэм'ера. **"Мацарт і Сальеры". 1 кастрычніка ў 18:30.**
• Балет у 3-х дзеях. **"Спартак". 2 кастрычніка ў 18:00.**
• Опера ў 2-х дзеях. **"Царская нявеста". 4 кастрычніка ў 19:00.**
• Балет у 3-х дзеях. **"Дон Кіхот". 5 кастрычніка ў 19:00.**
• Аперэта ў 3-х дзеях (выконваецца з адным антрактам). **"Лятучая мыш". 6 кастрычніка ў 19:00.**
• Балет у 2-х дзеях. Прэм'ера. **"Жызель". 7 кастрычніка ў 19:00.**
• Опера ў 3-х дзеях. **"Фаўст". 8 кастрычніка ў 18:00.**

УНП 191081322

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл. +375 (17) 203 07 92, +375 (29) 144 07 92, +375 (17) 327 11 66

• **Пастаянная экспазіцыя**.
• Выстава. **"Пасляваенная архітэктура Беларусі ў архіўных дакументах і матэрыялах. 1945-1955 гг". Да 24 кастрычніка.**
• Выставачны праект **"Вызваленне Еўропы" ў рамках Міжнароднага праекта "Тэрыторыя Перамогі"**, які абядноўвае 250 музеяў і ваенна-гістарычных цэнтраў Расіі і іншых замежных краін.
• Анлайн-выстава **"Пінская рачная ваенная флатылія".**

УНП 100235472

t.me/minkultrb

Афіцыйны Telegram-канал Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь — гэта магчымасць атрымліваць актуальную інфармацыю аб дзейнасці ведамства і ключавых падзеях сферы культуры.

Дзяржаўная ўстанова культуры «Цэнтралізаваная клубная сістэма Клічаўскага раёна» Магілёўскай вобласці

запрашае на працу спецыялістаў у Арэхаўскі сельскі Дом культуры (насельніцтва 1000 жыхароў, базавае сельгаспрадпрыемства УКСП "Саўгас"Дабраволец") і іншыя аграгарадкі раёна.
Зарплата згодна са штатным раскладам.
Даведкі па тэл.:
8-02236-78771, +375 (44) 3600281

Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь

аказвае фізічным і юрыдычным асобам паслугі па рэстаўрацыі і кансервацыі ікон, твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.
Тэлефоны: **(17) 397 01 63; (25) 667 78 19**

Вялікі тэатр Беларусі

абвяшчае конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па творчых спецыяльнасцях трупы оперы (артыст-вакаліст саліст) па наступных тыпах галасоў:
драматычны тэнар, барытон, каларатурнае сапрана і бас.
Дадатковая інфармацыя размешчана на сайце
bolshoibelarus.by

З пытаннямі размяшчэння рэкламы звяртайцеся па тэлефоне **8(017) 286 07 97** або па электроннай пошце **reklama@kultura-info.by**

Цікавыя віктарыны, афішы яркіх імпрэз, навіны культурнага жыцця – усё гэта ў нашым тэлеграм-канале **@kultinfa**

КУЛЬТУРА
Пераможца 2006 г.
Гран-пры 2010 г.
Пераможца 2022 г.

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".
Дырэктар — ДУЛЕВІЧ Віктар Іванавіч.
Першы намеснік дырэктара — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна.
Намеснік галоўнага рэдактара — ШЧУРОК Жанна Генадзьеўна;
Адказны сакратар — Галіна МАЛІНОЎСКАЯ;

Рэдактар аддзела: Яўген РАГІН;
Аглядальнікі рэдакцыі: Надзея БУНЦЭВІЧ, Антон РУДАК, Павел САЛАУЕЎ, Ілья СВІРЫН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ, Данііл ШЭЙКА, Зміцер ЮРКЕВІЧ, Настасся ЮРКЕВІЧ.
Прыёмная: (017) 334 57 41. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Чацвёрты паверх.
Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.

Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх.
Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23.
Тэлефон-факс: (017) 334 57 41.
Рэкламны аддзел: тэл: (017) 286 07 97.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
*Матэрыял на правах рэкламы.
©"Культура", 2022.
Сайт: www.kultura-info.by
e-mail: kim@kultura-info.by

Наклад 3126.
Індэксы 63875, 638752.
Рознічны кошт — па дамоўленасці.
Падпісана ў друк 30.09.2022 у 18:00. Замова №2378.
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Беларускі Дом друку".
220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.